16.Москва,Моховая 3,Публичн. библ-ка им.Ленина лит.рек. 1 Сч.-1

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцесь! — itkich krajów, łączcie się! — всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня. Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА 18 сьнежня 1931 г. № 290 (3379)

За высока якасную зімоўку

Посьпехі выкананьня жывёлагадоўчай праграмы 1932 г. у значнай меры залежаць ад таго наколькі будзе арганізавана зімоўка, наколькі саўгаснае і калгаснае стала будзе забясьпечана належным доглядам, наколькі будзе захаваны маладняк. Трэба добра памятаць, што разьмеры таварнай прадукцыі 1932 г. знаходзяцца ў прамой сувязі ад якасьці догляду за маладняком. Таму барацьба за поўнае захаваньне і вырашчваньне маладняка вяўляецца важнейшай задачай зімовага стойліва. Зімнае ўтрыманьне жывёлы—гэты экзамен саўгасаў і калгасаў. Намеціць і правесьці ў жыцьцё канкрэтныя мерапрыемствы, па баль шавіцку справіцца з пастаўленымі за дачамі па выкананьні праграмы сацыялістычнай жывёлагадоўлі—такая цэнтральная задача барацьбы за зімоўку.

«1931 і 1932 г. г. павінны быць гадамі такога-ж рашучага пералому ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 г.г. у справе арганізацыі сацыялістычнай збожжавай гаспадаркі» (з звароту ЦК УсеКП(б) і СНК СССР). Гэта баявая дырэктыва партыі і ўраду панінна быць практычна ажыцьцяўлена. Аб'яднаны лістапалаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове з асаблівай выразнасьцю падкрэсьліў, што «праблема разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і асабліва свінагалоўлі зьяўляецца актуальнай для БССР, як аднаго з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага саюзу» (З пастановы пленуму ЦК і ЦКК).

Параўнаўча за кароткі час мы ўжо маем значныя посьпехі ў справе разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Мы ўжо маем 184 жывёлагадоўчых саўгасаў, з якіх 85 свінагалоўчых з агульным пагалоўем 74.000 свіней. Арганізаваны 1.018 МТФ і 1.600 СКТФ. У параўнаньні з мінулым годам значна павялічылася здача таварнай прадукцыі. Разгорнута шырокае будаўніцтва скотнікаў, свінарнікаў, птушнікаў, трусаўнікоў; дасягнуты значныя посьпехі ў стварэньні кармавой базы. Але гэтыя посьпехі ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі зьяўляюцца толькі пачаткам. Гэтыя посьпехі ні ў якім разе ня могуць задаволіць нас у параўнаньні з тымі задачамі, якія стаяць у вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы. У радзе месц мы яшчэ не разгарнулі сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за поўнае і своячасовае выкананьне пляну жывёлагадоўлі. У радзе месц адсутнічае барацьба за высокія якасныя паказаньні. Маюць месца буйнейшыя страты, разбазарваньні і неэканомнае выдаткаваньне кармоў, дрэнна пастаўлена справа з камплектаваньнем саўгасных і калгасных фэрм, ня выканана будаўнічая праграма.

Гэтыя буйнейшыя прарывы павінны быць ліквідаваны ў бліжайшы час. Трэба дамагчыся, чаго-б там ні стала, каб зімоўка прайшла без страты на кароўніку, свінарніку. Трэба памятаць, што добра падрыхтованаму стаду не страшны ніякія марозы, не страшна зіма. Таму на барацьбу за высока якаснае ўтрыманьне стала на зімовым стойліве вясковыя партыйныя арганізацыі, сельсаветы, павінны мабілізаваць шырокія масы рабочых, калгаснікаў. Не ад выпадка да выпадку, а штодзённа павінны кіраваць работай жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў партячэйкі і сельскія саветы. Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове патрабуе ад кожнай вясковай ячэйкі, ад кожнага камуніста быць заўсёды на перадавых пазыцыях, па-бальшавіцку змагацца за сацыялістычную жывёлагадоўлю.

«Неабходна дабіцца такога становішча,—гаворыцца ў пастанове пленуму,—каб кожная партячэйка, кожны камуніст у паасобку, змагаліся за выкананьне плянаў жывёлагадоўлі так, як партарганізацыі перадавых прадпрыёмстваў змагаюцца за выкананьне прамфінплану». І далей у той жа пастанове досыць выразна запісана што:—«Важнейшай рашаючай задачай усіх камуністаў, працуючых у галіне жывёлагадоўлі, зьяўляецца сапраўднае аўладаньне тэхнікай жывёлагадоўчай справы. Гэта пленум ЦК і ЦКК лічыць абавязковым для кожнага камуніста жывёлагадоўчых саўгасаў, калгасаў і працуючых у зямельна-калгаснай сыстэме».

Аўладаць тэхнікай жывёлагадоўлі, дамагацца практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу—за тону апаросу—абавязак кожнай ячэйкі, кожнага вясковага камуніста. Нажаль гэтай, адной з важнейшых задач ня ўсе яшчэ ячэйкі ўразумелі. Чым іншым, калі не апартуністычнай недаацэнкай справы сьвінагадоўлі можна тлумачыць такое становішча, калі ў саўгасе імя Сталіна адыход парасят складае 68,5 проц., «1 мая»—78 проц., «Горкі-Аб чаг»—60,5 проц. Гэтае ганебнае зьявішча тлумачыцца выключна тым, што трыкутнік саўгасу яшчэ не павярнуўся тварам да жывёлагадоўлі, што ячэйкі гэтых саўгасаў яўна ігнаруюць жывёлагадоўлю прамфінпляванням.

Якасьць догляду — цэнтральнае зьвяно барацьбы за маладняк. На жаль, гэтаму зьвяну не даецца належнай увагі. Ня гледзячы на катэгарычныя прапановы аб пераводзе сьвінагадоўчых саўгасаў на зьдзельна-прэм'яяльную аплату працы, рад саўгасаў фактычна і на сёняшні дзень гэтага важнейшага мерапрыемства не праводзяць у жыцьцё. У большасьці саўгасаў яшчэ і зараз панує абязьлічка.

Разьвярнуць паход за правільную арганізацыю працы, на асновах зьдзельшчыны, абвясьціць вайну абязьлічцы—такая цэнтральная задача зімоўкі. У шасьці гістарычных умовах тав. Сталіна барацьба з абязьлічкай пастаўлена як важнейшая гаспадарча-палітычная задача. За абязьлічкай і ўраўнілаўкай хаваецца кулак і шкоднік. Абязьлічка і ўраўнілаўка—саюзьнік кулака і шкодніка. Карыстаючыся безадказнасьцю, адсутнасьцю вучоту і кантролю, клясавы вораг не прыкмечаным пранікае на паасобныя вучасткі сацыялістычнай вытворчасьці, стараецца з унутры ўварваць, разбурыць калгас.

Трэба дамагчыся таго, каб на скотным дварэ не засталося і сьледу абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Увайсьці без абязьлічкі ў другую зімоўку—вось задача, якую павінны паставіць перад сабою кожны саўгас і калгас. Трэба памятаць, што ад якасьці пастаўленай работы на кароўніку, свінарніку, ад правільнай арганізацыі працы і вучоту на аснове зьдзельшчыны, ад забесьпячэньня стада сьветлым, цёплым памяшканьнем, будуць залежаць посьпехі зімовага ўтрыманьня жывёлы, адгодуль—падвышэньне выхаду таварнай прадукцыі, павялічэньня самаго стада.

Трэба пакласьці канец раз на заўсёды злачынламу гаспадараньню абязьлічцы, апартуністычнай недаацэнцы арганізацыі працы. «Вопыт работы значнай часткі калгасаў паказаў, што там, дзе добра і правільна была арганізавана праца, там вышэй прадукцыйнасьць працы, своячасова выконваліся вытворчыя заданьні, менш было страт, большая атрымана даходнасьць». (З пастановы пленуму ЦК і ЦКК). Так калгас «Случ» (Случчына) дзякуючы прасільнай арганізацыі працы на фэрме на асновах зьдзельшчыны за чаўгода павялічыў сьвінае стада з 86 да 326 галоў, зьнізіў да мінімуму адыход маладняка, выканаў пляны здачы таварнай прадукцыі. Так і толькі так трэба змагацца за сацыялістычную жывёлагадоўлю.

Барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне жывёлагадоўчых калгасаў, барацьба за якасныя паказьнікі—важнейшая задача зімоўкі. Трэба добра памятаць, што пастаўленая партыяй цэнтральная задача на даным этапе калгаснага будаўніцтва-арганізацыйна - гаспадарчае замацаваньне калгасаў, павінна знайсьці сваё практычнае ажыцьцяўленьне ў жывёлагадоўчых калгасах.

Мы маем значныя дасягненьні ў арганізацыі жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм. Але мы яшчэ не дабіліся рашучага пад'ёму выхаду таварнай прадукцыі саўгасаў і калгасаў. На гэты вучастак і трэба сканцэнтраваць усю ўвагу. У радзе саўгасаў і калгасаў гэтаму галоўнаму пытаньню не надаецца належнай увагі. У радзе выпадкаў маюць месца яўнае разбазараваньне таварнай прадукцыі, ігнараваньне поўнага і своячасовага выкананьня пляну па здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі.

«Пленум катэгарычна патрабуе ад усіх кіраўнікоў Саўгастрэсту, дырэктараў саўгасаў, Белкалгасцэнтру, раённых партыйных арганізацый, партячэек, саўгасаў і калгасаў разгарнуць рашучую барацьбу за поўнае і своячасовае выкананьне пляну па здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, выкрываючы перад шырокімі масамі рабочых саўгасаў, МТС і калгаснікаў шкоднасьць існуючых кулацка - капіталістычных тэндэнцый. Не пазьней, як праз месяц увесьці ва ўсіх без выключэньня гаспадарках сацсэктару строгі вучот выхаду і кантроль за здачай таварнай прадукцыі, асабліва па сьвінагадоўчых фэрмах» (з пастановы пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Аб працы жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў партыя і савецкая ўлада будуць разглядаць перш за ўсё па вынікаў іх работы, гэта значыць па разьмерах захаваньня і вырашчваньні маладняка, па ступені выкананьня пляну здачы таварнай прадукцыі.

Наносячы сакрушальны ўдар па кулаку і яго агентуры, па кулацка-капіталістычных тэндэнцыях, па рвацка-спажывецкіх настроях, укрыцьці і разбазараваньні таварнай прадукцыі—трэба дабіцца поўнага і своячасовага выкананьня пляну. Мабілізуючы масы рабочых саўгасаў, шырокія калгасныя масы вакол задачы барацьбы за выкананьне пляну здачы таварнай прадукцыі жывёлагадоўлі,—партыйныя, савецкія органы і калгасна-кааперацыйныя арганізацыі павінны падначаліць гэтую задачу барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

2-я сэсія ЦВК БССР X скліканьня

Уступнае слова тав. Чарвякова

Сэсія ЦВК БССР адчынілася ўчора ўвечары ў клюбе харчавікоў уступным словам старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова.

— Таварышы, другая сэсія ЦВК БССР пачынае сваю работу ў апошнія дні трэцяга рашаючага году пяцігодкі, калі рабочая клясa, калгаснікі, усе працоўныя Савецкай Беларусі разам з працоўнымі Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК вядуць барацьбу за пасьпяховае скончэньне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Мінулы год быў годам напружанай барацьбы на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. За мінулы год мы дабіліся вялізарных посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Ленінскае пытаньне «хто каго» вырашана на карысьць сацыялізму За мінулы час уступіў у строй цэлы рад новых буйных прадпрыемстваў з ліку «518». Значная колькасьць старых прадпрыемстваў скончылі сваю рэканструкцыю. Колькасьць рабочых у прамысловасьці значна павялічылася. Роля прамысловасьці ў народнай гаспадарцы Савецкай Беларусі значна ўзрасла. Калі яшчэ ў мінулым годзе валавая прадукцыя прамысловасьці складала меншую частку усёй валавай прадукцыі народнай гаспадаркі БССР, дык у гэтым годзе валавая прадукцыя прамысловасьці складае 53 проц. усёй валавой прадукцыі народнай гаспадаркі БССР. На аснове посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва паляпшаецца добрабыт рабочае клясы.

Усе гэтыя посьпехі краіна саветаў мае дзякуючы пасьпяховаму ажыцьцяўленьню шасьці паказаньняў тав. Сталіна. Адначасова трэба адзначыць, што тыя недахопы і прарывы, якія маюцца на паасобных прадпрыемствах, зьвяўляюцца ў асноўным вынікам апартуністычнай недаацэнкі паказаньняў тав. Сталіна, няўменьнем перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі.

Посьпехі індустрыялізацыі краіны, рашучае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце на капіталістычныя элементы ўнутры краіны далі магчымасьць дабіцца буйных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

На 1 лістапада г. г. 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР ужо ўваходзіла ў калгасы.

Вырашыўшы ў асноўным зернявую праблему мы пасьпяхова вырашаем пытаньне аб пашырэньні тэхнічных культур, вядзем барацьбу за вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца падставай для далейшага разгортваньня калгаснага руху для ліквідацыі кулацтва як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі.

Ацэнка работы кожнага ў паасобку калгасу, калгаснага аб'яднаньня, саветаў і іншых грамадзкіх арганізацый будзе залежыць ад таго, у якой меры гэтыя арганізацыі перабудавалі сваю работу на вырашэньне задач па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў.

Недаацэнка гэтай важнейшай задачы зьяўляецца праяўленьнем апартунізму на практыцы, і вымагае з нашага боку самай рашучай барацьбы.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы, ствараюць умовы, на падставе якіх урад мае магчымасьць разгортваць усё большыя тэмпы сацыялістычна-культурнага будаўніцтва па цэлым радзе новых задач—на ўсеагульным навучаньні, па ліквідацыі няпісьменнасьці, па падрыхтоўцы кадраў, па мэдычным абслугоўваньні працоўных і г. д.

Разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, барацьба за вырашэньне задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, шырокае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце выклікае абвостранае супраціўленьне з боку клясавых ворагаў элемэнтаў.

Гэта работа адбываецца ва ўмовах надзвычайна абвостранай клясавай барацьбы. Гэта вымагае ад кожнага з нас узмоцненай клясавай пільнасьці, палітычнай сьвядомасьці для таго, каб даць клясаваму ворагу своячасовы рашучы адпор.

Вось чаму, таварышы, абставіны абвостранай клясавай барацьбы вымагаюць у нас пільных адносін да кожнай правы гэтай клясавай барацьбы, да канкрэтных носьбітаў буржуазных варожых тэндэнцый, якія заносяцца ў нашыя савецкія ўстановы.

Правы апартунізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Супроць гэтай небясьпекі мы пакі равалі галоўны агонь у сваёй барацьбе. Правы «левых» загібаў, якія вы разіліся на цэлым радзе вучасткаў нашай работы, што льлюць ваду на млын правага апартунізму, таксама павінны сустракаць рашучы адпор.

Барацьба супроць прыміранчых адносін да праву гэтага апартунізму зьяўлялася ўвесь час важнейшай задачай усіх нашых пралетарскіх арганізацый.

Сёньня мы павінны адзначыць, што тыя посьпехі, якія мы маем у справе сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца вынікамі рашучага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі і рашучай барацьбы супроць ухілаў ад ленінскай нацыянальнай палітыкі ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага, супроць шавінізмаў усіх іншых колераў.

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьба супроць шавінізмаў салдзейнічала яшчэ большаму замацаваньню інтэрнацыянальнай сувязі працоўных усіх нацыянальнасьцій для барацьбы за вырашэньне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, салдзейнічала яшчэ большаму замацаваньню сувязі Савецкай Беларусі з Савецкім Саюзам, салдзейнічала і салдзейнічае яшчэ большаму замацаваньню моцы СССР.

У той час, калі Савецкая Беларусь разам і пры дапамозе Савецкага Саюзу вядзе пераможную барацьбу за сацыялізм, у гэты самы час каліталістычны сьвет знаходзіцца ў палаце надзвычайна глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу.

У той час, калі ў нас тут будуюцца новыя фабрыкі і заводы, там у капіталістычных краінах, у выніку эканамічнага крызісу існуючыя фабрыкі і заводы або зусім зачыняюцца, або скарачаюць сваю дзейнасьць.

У той час, калі тут у Савецкім Саюзе колькасьць рабочых павялічваецца і дабрабыт іх паляпшаецца, там колькасьць беспрацоўных павялічваецца і становішча іх з кожным днём усё больш і больш пагаршаецца

У той час калі мы для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва імкнемся да таго, каб захаваць мір, каліталістычныя краіны на адварот, шукаючы выхаду з эканамічнага і палітычнага крызісу, пачынаюць усё больш і больш пад прыкрыцьцем услікага роду пацыфісцкіх дэманстрацый, узмацнёна рыхтуюцца да новай вайны, да нападу на СССР.

У апошнія дні мы маем зусім не двухсэнсовыя заявы з боку асобных прадстаўнікоў буржуазнай палітычнай думкі аб тым, што падзеі на Далёкім Усходзе адкрываюць жаданыя пэрспэктывы да выхаду з эканамічнага і палітычнага крызісу ў выглядзе новай вайны, якая можа ажывіць прамысловасьць, можа ажывіць гандаль, можа ажывіць крэдытны зварот і можа на некаторы час алтэрмінаваць канчатковы крах каліталістычнага ладу.

Тая перастаноўка сіл паміж каліталістычнымі дзяржавамі, якая ў сучасны момант адбываецца ў сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе, зьяўляецца падрыхтоўкай да новай вайны.

Вось чаму, вядучы мірную работу і мірнае будаўніцтва і ня спыняючы барацьбы за захаваньне міру, мы ў той жа час павінны зварочваць увагу на падзеі ў міжнародных адносінах, не забываючы ні на хвіліну аб неабходнасьці павялічэньня абароназдольнасьці нашай краіны, аб узмацненьні баяздольнасьці нашай Чырвонай арміі.

Мы знаходзімся ў апошніх днях 3-га рашаючага году пяцігодкі. У гэтыя дні нашы фабрыкі і заводы заканчваюць свае вытворчыя галавыя праграмы, заканчваецца пабудова новых прадпрыемстваў, абдываецца ўзмоцненая работа для таго, каб у вызначаныя тэрміны скончыць загатоўку с. г. прадуктаў. Усе вучасткі нашага будаўніцтва ў сучасны момант рыхтуюцца да таго, каб скончыўшы пасьпяхова трэці рашаючы год пяцігодкі, падрыхтаваць гэтым глебу для пасьпяховага разгортваньня работ 4-га завяршаючага году пяцігодкі.

Мы ў сувязі з II сэсіяй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту атрымалі рад рапартоў і паведамленьняў аб тым, што на гэтай Сэсіі асобныя прадпрыемствы заканчваюць свае вытворчыя праграмы, што асобныя саўгасы і калгасы заканчваюць пляны загатовак, што аднаасобнікі-беднякі і сераднякі таксама пасьпяхова выконваюць свае абавязкі.

Гэты ўздым у сувязі са скліканьнем і работай II сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту зьяўляецца адбіткам таго агульнага энтузіязму і ўздыму, той вытворчай ініцыятывы, якая наглядалася на працягу ўсяго гэтага часу, у выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сацыялістычныя мэтады працы: сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчны плян, скразныя брыгады, перабудова работы па новаму ў адпаведнасьці з новымі мэтадамі—вось, тое новае, што выкананьне пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі пасьпяхова заканчваецца.

Мы ўпэўнены ў тым, што будучы на II Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Савецкага Саюзу мы зможам далажыць нашаму Саюзнаму Ўраду аб тым, што ў Савецкай Беларусі задачы 3-га рашаючага году пасьпяхова вырашаюцца, што Савецкая Беларусь падрыхтавана для таго, каб уступіць у новы завяршаючы чацьверты год пяцігодкі.

Работа II Сэсіі ЦВК палягае яшчэ больш мабілізаваць сілы працоўных Савецкай Беларусі на выкананьне гэтых задач.

Паставіўшы перад сабой гэтыя вялізарныя задачы, дазвольце абвесьціць II Сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адкрытай. (Воплескі, інтэрнацыянал).

Учора на сэсіі

Дэлегаты сэсіі слухаюць даклад

◆ Будаўнічая выстаўка ў файэ клюбу дзе праходзіць пасяджаньне сэсіі, шчыты і транспаранты з лёзунгамі, аншлагі абцягнутыя вакол залі сэсіі—усё гэта падкрэсьлівае, што сэсія абгаварвае сёньня народна-гаспадарчы план на 1932 г., на IV завяршаючы год пяцігодкі.

◆ Сёньня сэсія слухала даклад старшыні Дзяржпляну БССР тав. Шапіра аб кантрольных лічбах на 1932 год. У канцоўцы дакладу тав. Шапіра разумаваны задачы БССР у IV-м заключным:

— Мы маем усе аб'ектыўныя даныя для выкананьня пляну. Мы маем багацейшыя энэргетычныя рэсурсы. Мы маем вялікае разьвіцьцё чыгуначнага транспарту, мы маем надзвычайна шырокую рачную сыстэму і нарэшце мы маем усё для выкананьня пляну ў IV-м рашаючым годзе пяцігодкі. Усё залежыць ад нас. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы гэты плян выканаем.

◆ Усё ранішняе і вячэрняе пасяджаньні сэсіі прысьвечаны спрэчкам па першых двух дакладах. Праз кожныя 10 хвілін зьмяняюцца прамоўцы на трыбуне, яны дасканала аб гаварваюць кантрольныя лічбы высунутыя дакладамі на сэсіі, яны гавораць аб капітальных укладаньнях, аб сыстэме кіраўніцтва, аб кадрах, аб торфе, аб жывёлагадоўлі...

— Гэта сапраўды вялізарная разгорнутая бальшавіцкая праграма—усклікае тав. Гарбачоў—дэлегат сэсіі.

◆ У 1870 годзе адзін з чыноўнікаў міністэрства народнай асьветы царскага ўраду падлічыў, што калі царызм будзе ўкладаць у народную асьвету сродкі ў такім-жа тэмпе як ён укладаў, дык усеагульнае навучаньне не можна будзе ўвесьці ў 2007 годзе.

З гэтага анэкдоту - былі пачаў сваю прамову тав. Некрашэвіч. І тут-та палае аб тым, што Савецкая Беларусь увяла ўсеагульнае навучаньне ўжо з гэтага году, і разгортвае малюнак культурнай рэвалюцыі ў 1932 г., у IV-м заключным годзе пяцігодкі.

◆ Пасьля 10-хвіліннага перапынку спрэчкі зноў працягваюцца. Выступае тав. Сямашка, за ім Рэдэр, потым Саўкоў, Папова, Балцін, Пракоп'еў.

◆ Аб МТС, аб трактарах, аб загатоўках, аб сыравінных рэсурсах і нават аб «дробязях»: аб смазцы для трактараў, аб уціле—гавораць удзельнікі сэсіі.

◆ Перад вячэрнім пасяджаньнем да клюбу харчавікоў падыходзяць калёны рабочых. Сёньня з удзелам дэлегатаў сэсіі ЦВК адкрываецца помнік Леніну перад фасадам клюбу харчавікоў.

◆ ... Скінут брэзэнт пакрываючы помнік. Вырастае магутная фігура Ільліча—правадыра сусьветнага пралетарыяту.

Тав. Чарвякоў на адкрыцьці помніка сказаў:

— Імя правадыра і настаўніка—гэта сьцяг барацьбы пралетарыяту і прыгнечаных усіх краін за пралетарскую дыктатуру. Са сьцягам Леніна мы змагаемся і перамагаем.

◆ А некалькі раней да будынку пасяджаньня сэсіі пад'ехаў чырвоны абоз з 70 фурманак са збожжам і лёнам.

◆ Шматлікія дэлегацыі ад фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў рапартамі і прывітаньнямі расказваюць сэсіі аб сваіх перамогах у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, аб тым, як яны гатовы да ўступленьня ў чацьвёрты завяршаючы.

◆ На працягу ранішняга і вячэрняга пасяджаньня сэсія заслухала прывітаньні ад калгасу імя Ланцуцкага, Копыскага раёну, ад жлобінскіх чыгуначнікаў, ад трактарыстаў і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу Заслаўскай МТС, ад чырвонаштандарнага калектыву зав. імя Варашылава і «Бальшавіка», які скончыў датэрмінова праграму 3-га рашаючага. На сэсіі выступілі пераможцы пяцігодкі ў тры гады,—рабочыя швэйнай фабрыкі «Акцябр».

◆ Вячэрняе пасяджаньне скончылася заключнай прамовай т. Галадзеда.

Да другой сэсіі ЦВК БССР X-га скліканьня

Сёньня, 18 сьнежня 1931 году, на ранішнім пасяджэньні (з 10 гадзін раніцы) у памяшканьні клюбу харчавікоў будуць заслуханы:

а) даклад СНК БССР аб фінпляне і дзяржбюджэце БССР на 1932 г. і выкананьні дзяржбюджэту 1929-30 г. Дакладчык тав. А. І. Хацкевіч; б) садаклад Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР аб фінпляне і дзяржбюджэце БССР на 1932 г. і выкананьні дзяржбюджэту 1929-30 г. Садакладчык тав. А. Я. Калнін; в) спрэчкі па паказаным пытаньні.

На вячэрнім пасяджэньні (з 6 гадзін)—працяг спрэчак і заключнае слова т. т. Калніна і Хацкевіча па дакладу аб фінпляне і дзяржбюджэце БССР на 1932 г. і выкананьні дзяржбюджэту 1929-30 г.

Сакратар ЦВК БССР М. Гнілякевіч.

Пралетарскаму паэту тав. Александровічу ў дзень дзесяцігадовага юбілею--бальшавіцкае прывітаньне

Пяўцу пралетарскай барацьбы

Дарагі таварыш Александровіч!

Шчыра вітаю Вас з дзесяцігадовым юбілеем літаратурнай працы.

Пройдзены Вамі шлях красамоўна сьведчыць аб тым, што адзінай крыніцай творчай дзейнасьці пралетарскага паэты зьяўляецца барацьба рабочае клясы пад кіраўніцтвам кампартыі за сацыялізм, што пралетарскі паэта дасягае вышэйшага разьвіцьця сваёй творчай дзейнасьці толькі пры ўмове непасрэднага ўдзелу ў практычнай барацьбе за сацыялізм.

Вы былі адным з тых, хто пад кіраўніцтвам партыі зразумеў клясава варожую сутнасьць нацыянал-дэмакратызму і яго агентуры ў партыі—нацыянал-апартунізму і ўступіў у барацьбу за ленінскае ажыцьцяўленьне нашай палітыкі, у змаганьне супроць праяў шавінізму і апартунізму.

Ваш творчы талент знаходзіцца на вышыні росквіту. Трэба дамагацца таго, каб гэты талент быў цалкам скарыстаны для пераможнай бальшавіцкай барацьбы на канкрэтных вучастках сацбудаўніцтва, для перамогі ідэі марксізма-ленінізму,—генэральнай лініі партыі.

Выказваю ўпэўненасьць, што бальшавіцкая закалка, атрыманая Вамі за мінулы час забясьпечвае пасьпяховасьць Вашай далейшай літаратурнай дзейнасьці пралетарскага паэты.

А. Чарвякоў.

17 сьнежня 1931 г. г. Менск.

Аўтару-- „Цені на сонцы“--

пісьменьніку, менавіта аўтару тав. Александровічу А.

(У зьвязку з дзесяцігадовым юбілеем літаратурнай дзейнасьці)

Дзякуючы шырокаму разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэвалюцыі разьвіваецца і ўмацоўваецца пралетарская па зьместу і нацыянальная па форме культура.

Літаратурны фронт і ўвесь фронт мастацтва наогул мае вялікае значэньне, асабліва ў рэканструкцыйны пэрыяд. Перад пралетарскім літаратурным рухам, які разгортваецца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, стаяць вялікія задачы стварэньня сапраўднага мастацтва бальшавізму. Пралетарскі мастак павінен аўладаць марксыцка-ленінскім сьветапоглядам і мэтадалёгіяй з тым, каб творчасьць пралетарскага пісьменьніка яскрава адбівала эпоху пралетарскай сацыялістычнай рэвалюцыі, эпоху гераічнай будоўлі сацыялізму ў нашай краіне, каб яна (творчасьць) мабілізавала масы на барацьбу за генэральную лінію нашай партыі, на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сіла пралетарскай літаратуры ў яе інтэрнацыянальным клясавым адзінстве. Змаганьне з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з нацыянал-дэмакратызмам—гэтай агентурай фашыстаўскіх інтэрвэнтаў, з шавінізмамі іншых колераў, барацьба за ідэалёгічную вытрыманасьць літаратурнага фронту, барацьба за партыйнасьць у літаратуры—гэта ёсьць першачарговыя абавязкі пралетарскага пісьменьніка БССР.

Вітаю з дзесяцігадовым юбілеем літаратурнай дзейнасьці, жадаю далейшай пасьпяховай працы ў барацьбы за гегемонію марксо-ленінскіх ідэй у пралетарскай літаратуры.

М. Галадзед.

МЕНСКІ ГАРАДСКІ ТЭАТР

Сёньня 18 сьнежня г. г. адзінаўзенна ўрачысты вечар

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

10 гадовай літаратурнай дзейнасьці пралетарскага паэты АНДРЭЯ АЛЕКСАНДРОВІЧА

Пачатак а 7-й гадзіне. — Уваход па заграшальных білетах. — Білеты можна атрымаць у Доме Пісьменьніка і кампэтарыі тэатру.

Усесаюзную праверку разьмеркаваньня калгасных даходаў

увязаць з конкурсам ЦО „Правды“

Ажыцьцёвім пастанову лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб арганізацыі сталых „дзён калгасьніка“

Арганізаваць самаправерку

Разьмеркаваньне калгасных даходаў зьяўляецца важнейшым зьвяном арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Вось чаму зусім невыпадковым зьяўляецца тое, што вакол разьмеркаваньня калгаснага ўраджаю разгараецца клясавая барацьба. Кулак і яго агентура—імкнуцца працятваньнем у разьмеркаваньне калгасных даходаў ураўнілаўкі падрываць зьдзельшчыну, каб па гэтай аснове дэзарганізаваць калгасную вытворчасьць і скампраметаваць калгас перад аднаасобнікам. На вучастку разьмеркаваньня калгасных даходаў кулак імкнецца распаліць дробнаўласьніцкія, спажывецкія настроі сярод асталай часткі калгасьнікаў.

Зусім зразумела, што на гэты вучастак калгаснага будаўніцтва—на вучастак правільнага разьмеркаваньня калгасных даходаў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага ўсіх партыйных, калгасных і зямельных арганізацый. Але на справе гэта далёка ня так. Той факт, што на гэтым вучастку калгаснага будаўніцтва мы маем вялікія прарывы, якія сьведчаць аб тым, што да правільнага разьмеркаваньня калгасных даходаў няма належнай увагі, што некаторыя нават раённыя арганізацыі апартуністычна недаацэньваюць гэтай справы.

У нас, у БССР—прыблізна больш трэцяй часткі калгасаў яшчэ зусім не прыступілі да работы па разьмеркаваньні ўраджаю. У цэлым радзе ня толькі паасобных калгасаў, але ў калгасах раёну дапушчаны грубейшыя скрыўленьні ў разьмеркаваньні ўраджаю.

У сьвеце гэтых фактаў у нас, набывае асаблівае значэньне абвешчаная праўленьнем Калгасцэнтру СССР усесаюзная праверка разьмеркаваньня калгасных даходаў і выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Гэта праверка павінна зрабіцца масавым аглядам-самаправеркай выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб парадку разьмеркаваньня калгасных даходаў, а таксама праверкай выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажы) таварных лішкаў.

Усесаюзная праверка разьмеркаваньня калгасных даходаў пабывае асабліва важнае значэньне яшчэ і таму, што яна павінна ахапіць праверку ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны ў калгасах і пастаноўку вучоту. Бяз зьдзельшчыны, бяз правільнага ўліку працы ня можа быць і гутаркі аб разьмеркаваньні ўраджаю па колькасьці і якасьці працы, па прынцыпе «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае».

Брыгадам, згодна пастановы Калгасцэнтру СССР, даецца права з пагодженьнем з райкалгассаюзам, ставіць пытаньне перад калгасам аб адмене няправільнага разьмеркаваньня калгасных даходаў. Апроч таго, брыгады, пастановай Калгасцэнтру СССР, абавязваюцца бездакладна арганізаваць здачу дзяржаве прадукцыі ў тых калгасах, дзе плян загатовак ня выкананы.

Вялізарнейшае значэньне, якое надаецца партыяй і ўрадам гэтай работе ставіць перад усімі партыйнымі, калгаснымі і зямельнымі арганізацыямі адказнейшую задачу—да-бальшавіцку ўзяцца за арганізацыю гэтай главой праверкі выкананьня калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і разьмеркаваньня калгасных даходаў.

Рабселькоры і бальшавіцкі друк, у сувязі з абвешчаным ЦО «Правдой» конкурсам на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў,—павінны па-баявому ўключыцца ў праверку разьмеркаваньня калгасных даходаў.

Партыйныя арганізацыі павінны ў першую чаргу забясьпечыць выкананьне гэтай ударнай работы штодзённым бальшавіцкім кіраўніцтвам. У самаправерачныя брыгады павінны вылучацца лепшыя ўдарнікі-калгасьнікі, якія-б забясьпечылі поўнае выкананьне пастаўленых задач перад праверкай.

Забясьпечаньне гэтай ударнай выключна важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі кіраўніцтвам, належная ўвага з боку партыйных, калгасных і савецкіх арганізацый—парука таго, што гэта работа дасьць магчымасьць па-бальшавіцку выправіць дапушчаныя ў разьмеркаваньні калгасных даходаў скажэньні, і згрупаваць калгасьнікаў на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Усесаюзная праверка разьмеркаваньня калгасных даходаў

Пастанова Калгасцэнтру СССР

Прапанаваць усім краявым, абласным і рэспубліканскім калгассаюзам арганізаваць унутры сельсаветаў суцэльную праверку па калгасах выкананьня пастановы НКЗему і Калгасцэнтру па пытаньні разьмеркаваньня даходаў у калгасах і выкананьня калгасамі дзяржаўных абавязацельстваў.

Для праверкі арганізаваць брыгады ад 3-5 чалавек з актыву калгасьнікаў. Увесьці ў склад брыгад калгасьніц і камсамольцаў.

Кожная брыгада павінна абсьледаваць ня больш 5 калгасаў. Уся работа праводзіцца ў парадку грамадзкай нагрузкі.

Па прыбыцьці ў калгасы брыгадзіры абавязаны:

Склікаць паседжаньне праўленьня калгасаў разам з раўкамісіяй і праінфармаць аб сваёй рабоце, намеціць разам плян работы.

Брыгада калгасьнікаў займаецца па ступнямі пытаньнямі:

а) нормы выпрацоўкі на паасобныя віды работы;

б) фактычнае выкананьне ўстаноўленых норм выпрацоўкі і якасьць работы;

в) як улічваюцца ці запісваюцца выкананыя работы ў паіменных сьпісах і працоўных кніжках;

г) колькі атрымана ўраджаю па паасобных відах культур;

д) як калгасы ўлічвалі атрыманы ўраджай і прадукцыю ад іншых галін гаспадаркі: жывёлагадоўлі, птушніцтва, падсобных прадпрыемстваў;

е) колькі паводле пляну трэба было прадаць прадуктаў дзяржаве;

ж) колькі фактычна прадана прадуктаў дзяржаве;

з) як ацэньваецца жаночая праца, ці няма выпадкаў паніжэньня іх ацэнкі;

і) як калгасы разьмеркавалі натуральную частку даходаў паміж сваімі членамі;

к) ці выдаваўся калгасьнікам аванс па працадніёх ці едаках і як утрымліваюцца гэтыя авансы пры разьмеркаваньні даходаў. Як разьмеркаваны даходы паміж калгасьнікамі. Ці абгаворваўся праект разьмеркаваньня даходаў калгасу на агульным сходзе калгасьнікаў (даход на калгасьніка ў параўнаньні з даходам аднаасобнай гаспадаркі ў мнулым).

Увага: Калі брыгада выкрывае скажэньне ў разьмеркаваньні даходаў, дык яна абавязана пагадзіць пытаньне з райкалгассаюзам аб адмене старога разьмеркаваньня. Склікаць сход калгасу, на якім паставіць пытаньне аб адмене і абрацьі камісію для суцэльнай праверкі данага пытаньня.

Усклаьці таксама на брыгады абавязацельнасьць бездакладна арганізаваць здачу прадукцыі дзяржаве ў тых калгасах, якія ня выканалі пляну загатоўкі. Па сканчэньні работы ўсе брыгады павінны напісаць дакладныя запіскі ў Калгасцэнтр з паказаньнем стану работы калгасаў і што імі прароблена.

Пасьля сканчэньня работы брыгада павінна склікаць сход калгасьнікаў і паставіць свой інфармацыйны даклад.

Інструктаваньне брыгад-калгасьнікаў ускласьці на праўленьні райкалгассаюзаў.

Абавязаць праўленьні райкалгассаюзаў забясьпечыць прысылку дакладных запісак усіх брыгад калгасьнікаў у Калгасцэнтр і арганізаваць раённыя нарады з брыгадамі для паведамленьня аб праробленай рабоце на месцы і абмене вопытам работы. Пра сіць актыў калгасьнікаў асьвятляць свае матар'ялы ў мясцовых аблясных і цэнтральных газэтах. Даручыць масаваму сэктару праверыць, як месцы арганізуюць гэту работу.

Падагулены матар'ял далажыць праўленьню не пазьней 25 студзеня 1932 году.

Больш увагі арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў

БАРЫСАЎ. (Белта). Рад калгасаў Барысаўскага раёну, як «Іскра», «Чырвоны дуб», імя Чарвякова і інш. маюць значныя посьпехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Разьмеркаваньне ўраджаю скончана і перавыкананы абавязкі па прадажы дзяржаве таварных лішкаў. Жывёла поўнасьцю забясьпечана кармамі, створаны семянныя і страхавыя фонды.

Побач з гэтым, ёсьць рад калгасаў, якія слаба змагаюцца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне. Праўленьні калгасаў «Усход», «Чырвоная зьмена» і інш. праяўляюць ня толькі палітычную блізарукасьць, але і проста падпадаюць пад уплыў клясавага ворага. Ня рэдкі прыклады зьніжэньня ўраджаю, укрыцьця таварных лішкаў.

Разьмеркваньне ўраджаю не атрымлівае дастатковай увагі праўленьня, факты скрыўленьня правільных установак—ня рэдкі. За адзін працадзень у калгасе «Пяцігодка» калгасьнік атрымлівае 20 кілё бульбы і 27 кілё сена, што перавышае нормы і скрыўляе ўказаньні аб разьмеркаваньні прыбыткаў.

Райкалгассаюз сурова асудзіў практыку некаторых калгасаў, старшыні калгасу вынесена суровая вымова. Выяўлена, што рад сельсаветаў і парт ячэек раёну не ўзначалілі барацьбы за ўмацаваньне калгасу.

Да вынікаў аб'яднанага пленуму Менскага гаркому і ГарКК КП(б)Б

16 сьнежня скончыў работу аб'яднаны пленум Менскага гаркому КП(б) і Гарадзкой кантрольнай камісіі. Пленум разгледзеў тры асноўных пытаньні: аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, аб рабоце Менскай камсамольскай арганізацыі і становішчы партыйнага кіраўніцтва камсамолам і аб пытаньнях гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі.

Менская партыйная арганізацыя, ня ўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію нашай партыі бязьлітасна змагаючыся супроць правага ўхілу галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» загібаў, а таксама з прымірэнчымі адносінамі да ўсякіх ухілаў, дасягнула буйнейшых посьпехаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. На 10 сьнежня ўжо калектывізавана 68 проц. усіх бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, а па плошчы калектывізавана 76 проц. раёну, што дала магчымасьць аб'яднаному пленуму лічыць калектывізацыю Менскага раёну ў асноўным закончанай.

У праведзенай вясновай сяўбе, ўборачнай кампаніі і асеньня - пасеўнай кампаніі калгасы Менскага раёну ях і ўвесь калгасны сэктар БССР і ўсяго Савецкага Саюзу давялі сваю абсалютную перавагу над аднаасобным сэктарам, значна пашырыўшы пасяўную плошчу, у асноўным пасьпяхова справіўшыся з уборачнай і асеньня - пасяўной кампаніяй.

Ужо ў гэтым годзе калгасы занялі пераважнае месца ў загатоўчым пляне раёну. Удзельная вага калгасаў у загатоўчым пляне па зернявых культурах складае 63 проц.; па бульбе—68 проц., і па гародніне—98 проц.

Значная работа ўжо праведзена ў галіне спэцыялізацыі калгасаў. Па раёне арганізавана 56 малочных таварных фэрм, у якія пастаўлены 5.919 кароў. Арганізавана 6 сьвінагадоўчых фэрм з агульным лікам 880 галоў сьвіней. Таксама арганізавана 52 гародна - садовых фэрмы. Праведзеныя мерапрыемствы па спэцыялізацыі калгасаў ужо далі значную гаспадарчую эфэктыўнасьць. Малочныя фэрмы ў гэтым годзе здалі дзяржаве 1845,3 тоны малака.

Галоўная задача партыйнай арганізацыі заключаецца ў тым, каб цэнтр работы перанесьці на замацаваньне дасягнутых посьпехаў у галіне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі — на арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Барацьба за гаспадарча - моцны калгас зьяўляецца зараз цэнтральнай задачай Менскай партыйнай арганізацыі. Аднак, аб'яднаны пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што іменна на гэтым важнайшым вучастку работы яшчэ не дасягнуты рашучы пералом.

У значнай колькасьці калгасаў як «Адраджэньне», імя Сталіна, «Чырвоны спэцыялісты», імя Будзённага і інш. арганізацыя працы пастаўлена вельмі дрэнна. Паказаныя калгасы мелі буйнейшыя прарывы ў выкананьні сваіх гаспадарчых плянаў з-за таго, што амаль палова рабочай сілы не выкарыстоўваецца, каля 45—50 проц. рабочай сілы зусім ня выходзіць на работу.

Пленум падкрэсьліў, што перавод калгасаў на зьдзельшчыну праходзіць недапушчальна марудна. Распаўсюджана такое становішча, калі калгас лічыцца пераведзеным на зьдзельшчыну, а па сутнасьці ніякай зьдзельшчыны там не практыкуецца. Поўная адсутнасьць вучоту, абязьлічка ў доглядзе за жывёлай і інвэнтаром разьядае калгасы і ўтварае недапушчальную безгаспадарчасьць. Такое становішча прыводзіць да таго, што большасьць калгасаў яшчэ не выкарыстоўваюць вялізарнейшых магчымасьцяй разьвіцьця высокатаварнай гаспадаркі, якія ствараюцца ўмовамі буйных калектыўных гаспадарак. Таму мы маем у радзе калгасаў вельмі малы выхад таварнай прадукцыі, ніз кую ўраджайнасьць, нізкую ўдойнасьць малочнага статку, нязначны выхад таварных сьвіней пры высокім адыходзе маладняка. Наяўнасьць спажывецкіх настрояў у калгасах прыводзіць да таго, што вялікая колькасьць таварнай прадукцыі застаецца ў калгасах, пры гэтым трэба падкрэсьліць, што гэтыя спажывецкія настроі далёка ня ўсюды сустракаюць бальшавіцкі адпор з боку партыйных ячэек.

Пленум прапанаваў усім сельпарткомам і партыйным ячэйкам сканцэнтраваць усю ўвагу на ўзьняцьце якасьці калгаснай вытворчасьці, на сапраўднае ўкараненьне зьдзельшчыны ва ўсе галіны работы, на лепшую арганізацыю працы на аснове цьвёрдых норм выработкі ацэненай у працадніёх, на карэннае палепшаньне вучоту калгаснай маемасьці, вучоту калгаснай працы, без чаго не магчыма сапраўднае ажыцьцяўленьне зьдзельшчыны. Пленум катэгарычна прапанаваў усім партыйным ячэйкам не пазьней 20 сьнежня забясьпечыць поўнае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай па ўсіх відах загатовак. Гэта патрабуе ад партыйных ячэек самай бязьлітаснай барацьбы супроць кулацка - спажывецкіх настрояў, якія яшчэ існуюць у калгасах, рашучай ачысткі калгасаў ад кулакоў і іх агентаў узмацненьня сыстэматычнага кіраўніцтва ходам разьмеркаваньня ўраджаю з боку партыйных ячэек, на аснове разгортваньня шырокай масава - выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў, і беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў.

Пленум даў рад канкрэтных дырэктыў і абавязаў гарсавет, райкалгассаюз і МТС неадкладна разгарнуць работу па падрыхтоўцы да вясеньня-пасеўнай кампаніі, забясьпечыўшы да лейшае ўзьняцьце ўраджайнасьці, а таксама і далейшую спэцыялізацыю калгасаў.

У галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі пленум абавязаў райкалгассаюз забясьпечыць укамплектаваньне малочных сьвінагадоўчых і птушкаводных таварных фэрм, пры чым асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на хутчэйшае ўкамплектаваньне і лепшую пастаноўку працы ў племянных гаспадарках і гаспадарках буйнай рагатай жывёлы. У бліжэйшую дэкаду павінна быць закончана прыстасаваньне і ацяпленьне хлявоў і сьвінарнікаў. Рашучая барацьба павінна быць праведзена за поўнае захаваньне і гадоўлю маладняка.

Пленум абавязаў усе ячэйкі КП(б)Б, сельпарткомы і сельсаветы рашуча змагацца з недаацэнкай аднаасобнага сэктару, намеціўшы канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак да вясеньня - пасеўнай кампаніі.

Па дакладу аб рабоце камсамольскай арганізацыі і становішчы партыкіраўніцтва пленум канстатаваў, што за апошні год Менская камсамольская арганізацыя мае буйнейшыя посьпехі ў галіне перабудовы сваёй работы ў напрамку рашучага падвышэньня ролі камсамольскай арганізацыі як у гаспадарчай рабоце, так і ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

У жорсткай барацьбе супроць усякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі камсамольская арганізацыя ідэёва вырасла і значна загартавалася. Рашучым чынам павысіўся практычны ўдзел камсамольскай арганізацыі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну ў нашай сацыялістычнай прамысловасьці. Камсамольцы на вытворчасьці зьяўляюцца застрэльшчыкамі разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, укараненьня гасразьліку і інш. Гэта пацьвярджаецца наяўнасьцю 180 маладзёжных гасразьліковых брыгад па прадпрыемствах Менску, якія паказваюць лепшыя прыклады работы і 106 плянава - арацыйных груп якія ахопліваюць 913 камсамольцаў.

Менская камсамольская арганізацыя дабілася значных посьпехаў у галіне практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу аб 100 проц. ахопе рабочай моладзі камсамолам. За 11 месяцаў 1931 г. у камсамол прынята 615 чалавек. На сёньняшні дзень па радзе вядучых галін прамысловасьці ўжо завяршаецца задача 100 проц. уцягненьня моладзі ў камсамол. Так на машынабудаўнічай прамысловасьці ў камсамол уцягнута 92 проц. усёй моладзі, па транспарту—89 проц. Агульны ахоп рабочай моладзі па гораду —74 проц.

Разам з гэтым пленум адзначыў рад буйнейшых недахопаў у рабоце камсамольскай арганізацыі, якія ў асноўным заключаюцца ў тым, што ў значнай частцы арганізацыі гораду і вёскі перабудова саюзнай работы праведзена фармальна, дрэнна пастаўлена работа па замацаваньні навічкоў камсамольцаў, недастаткова пастаўлена выхаваўчая работа, наяўнасьць прарыву ў вясковай частцы камсамолу ў галіне арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў і адсутнасьць сапраўднай барацьбы за аўладаньне тэхнікай.

Пленум вызначыў рад канкрэтных дырэктыў, якія павінны быць пакладзены ў аснову далейшай работы камсамольскай арганізацыі, гэтыя дырэктывы ў асноўным зводзяцца да таго, каб у далейшым рашуча ўзмацніць парткіраўніцтва камсамолам, яшчэ больш узьняць клясавую пільнасьць камсамольскай арганізацыі і яе няпрымірымасьць у барацьбе за генэральную лінію партыі, на аснове разгортваньня глыбокай выхаваўчай работы сярод камсамольцаў. Цэнтр увагі камсамольскай работы павінен быць сканцэнтраваны на рашучай барацьбе за ўкараненьне гасразьліку ў прамысловасьці, на разгортваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, на аўладаньне тэхнікай. Што да вясковай часткі камсамолу, то асноўнай задачай тут зьяўляецца работа па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, выкананьня загатоўчых плянаў і падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Пленум пастанавіў склікаць партыйную канфэрэнцыю на 5 студзеня 1932 г. Задача Менскай партыйнай арганізацыі заключаецца ў тым, каб у парадку разгорнутай падрыхтоўкі да канфэрэнцыі забясьпечыць поўнае выкананьне вызначаных канкрэтных мерапрыемстваў пленумам, асабліва ў галіне выкананьня загатоўчых плянаў і арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

На аснове бязьлітаснай барацьбы са ўсякім, праяўленьнем правага апартунізму, «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўсякіх ухілаў, на аснове рашучага ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна Менская партыйная арганізацыя забясьпечыць пасьпяховае выкананьне тых дырэктыў, якія дадзены аб'яднаным пленумам гаркому КП(б)Б і кантрольнай камісіі.

Л. Н-кін.

Трацкісцкі кантрабандыст Слуцкі выключаны з партыі

МАСКВА. 14-XII. Парткалегія Красна - Прэсьненскага райкому абмеркавала пытаньне аб Слуцкім, які напісаў антыпартыйны трацкісцкі артыкул «Бальшавікі нямецкай сацыял - дэмакратыі ў пэрыяд яе перадваеннага крызісу», зьмешчаны ў часопісу «Пралетарская рэвалюцыя» № 6 за 1930 г. Парткалегія канстатавала, што артыкул Слуцкага зьяўляецца трацкісцкім скажэньнем вузлавых пытаньняў гісторыі бальшавізму і трацкісцкім паклёпам на Леніна і нашу партыю. Парткалегія канстатавала, што спробы Слуцкага спаслацца на свае «добрыя суб'ектыўныя намеры» фактычна азначаюць імкненьне Слуцкага зьняць з сябе адказнасьць за прапаганду трацкізму, якая ім праводзілася. Парткалегія лічыць, што працягваньне Слуцкім контр-рэвалюцыйнай трацкісцкай кантрабанды зьяўляецца невыпадковым. Парткалегія ўстанавіла, што выступленьне Слуцкага бязумоўна зьвязана з яго меншавіцкім мінулым, і расьцэньвае артыкул Слуцкага, як сьвядомае выкарыстаньне партыйнай літаратуры для прапаганды трацкізму, які зьяўляецца перадавым атрадам контррэвалюцыйнай буржуазіі.

ПАРТКАЛЕГІЯ ПАСТАНАВІЛА:

Слуцкага, служачага - інтэлігента, які мае вышэйшую адукацыю, кандыдата партыі з 15 ліпеня 1930 г., выхадца з меншавіцкай партыі, за антыпартыйнае выступленьне ў друку з мэтаю дыскрэдытацыі Леніна і нашай партыі, за сьвядомае скарыстаньне партыйнай літаратуры для фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму і працягваньня трацкісцкай кантрабанды — З КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ ВЫКЛЮЧЫЦЬ.

Уключаемся ў конкурс ЦО „Правды“

Селькоры калгасьнікі і рэдкалегія штодзённі калгасу «Чырвоны працаўнік» (В. Сьліўскага сельсавету, Слуцкага раёну) уключылася ва Ўсесаюзны конкурс, абвешчан ЦО ленінскай партыі «Правдой» на лепшую работу пізавых газэт па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Канкрэтна рабселькоры і калгасьнікі абавязаліся па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў правесьці наступнае:

Дапамагчы ўмацаваць СТФ і МТФ, для чаго дабіцца 100 процантнага іх укамплектаваньня.

Штодзённа змагацца за меншы процант адыходу сьвінапагалоўя і за 100 процантнае выхаваньне маладняка.

Шляхам барацьбы за ўвядзеньне зьдзельшчыны на ўсіх вучастках калгаснай працы змагацца за лепшы догляд жывёлы, за рацыянальнае скары стоўваньне кармоў.

Штодзённай работай наладзіць правільную арганізацыю і ўлік калгаснай працы.

У рабоце газэты і ў арганізатарскай рабоце змагацца за сваячасовую падрыхтоўку да веснавой сяўбы, за прывядзеньне ў належны парадак і рамонт інвэнтара.

Штодзённа весьці работу па арганізацыі адыходніцтва.

Змагацца за 100 процантнае выкананьне пляну здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Для ўсяго гэтага дабіцца рэгулярнага выхаду ў сваім і суседніх калгасах штодзённі.

Па ўсіх узятых абавязках рабселькоры і калгасьнікі выклікаюць на сацспаборніцтва калгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Будаўнік» і «1-га жніўня».

Самусевіч.

За сталы „дзень калгасьніка“!

Бацэвіцкі сельком саюзу працасьветы, Клічаўскага раёну, уключыўся ў сацспаборніцтва за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў».

Выпрацаваны дадатак да праграмы-мінімум, які прадугледжвае пастаноўку культмасавай работы ў калгасах пад кутом гледжаньня арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Усе асьветнікі разьбіты на брыгады, якія прымацаваны да пэўных калгасаў і вёсак для сталай і штодзённай работы па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях. Брыгадай асьветнікаў і райкалгассаюзу выяўлена, што ў калгасе імя Дзяржынскага рахункавод пры разьмеркаваньні ўраджаю ўключыў у разьмеркаваньне тыя фонды, якія не прадугледжаны законам ураду, а таксама напісаў са бе і сваім сваяком шмат працадзён, якіх яны фактычна ня выпрацавалі. У выніку гэтага атрымалася, што ў калгасе няма чаго разьмяркоўваць. Уся гэта шкодная работа рахункавода калгасу імя Дзяржынскага была выкрыта ў насьценгазэце.

Брыгада выявіла, што ў калгасе Бацэвічы панує поўная абязьлічка, інвэнтар валяецца на дварэ. Жывёла знаходзіцца ў дрэнных умовах, без належнага догляду, у выніку чаго адна карова ўдавілася бульбай, двое коняй зьелі ваўкі, племянная цёлка, якую вадзілі ў Клічаў на выстаўку, «зьбегла невядома куды».

Сельком саюзу, улічваючы важнасьць арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, мабілізаваў асьветніцкія масы на ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна. Настаўніцтва Бацэвіцкага сельсавету пастаравіла арганізаваць брыгады імя газ. «Савецкая Беларусь», якія прымацоўваюцца да калгасаў для дапамогі рэдкалегіям у выпуску сталых насьценгазэт з устаноўкай на ажыцьцяўленьне паказаньняў тав. Сталіна, на ажыцьцяўленьне ўмоў абвешчаных конкурсам «Правды».

На нарадзе асьветнікаў з удзелам прадстаўніка рэдакцыі «Савецкай Беларусі» была высунута думка аб арганізацыі сталага «дню калгасьніка» у калгасах на аснове пастановы лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б, які «даручае бюро ЦК распрацаваць мерапрыемствы па палітвыхаваньні калгасных мас (вячорнія школы, гурткі, разыё, лекцыі, даклады, спэцыяльнае правядзеньне дзён калгасьнікаў і г.д.» (3 паст. аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

«Днём калгасьніка» трэба панесьці рашучы ўдар клясава-варожым элемэнтам, якія імкнуцца скарыстаць «вячоркі» і «досьвіткі» для сваіх мэт.

«Дзень калгасьніка» павінен прахо дзіць пад лёзунгам барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Асьветнікі.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 290 (3379)

Барацьба за лён

Падхапіць пачын калгасу імя Сталіна

па арганізацыі ільнянога чырвонага абозу імя II сэсіі ЦВК БССР

Браць прыклад з лепшых барацьбітоў за лён

Загатоўка тэхкультур зьяўляецца адной з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаніі на вёсцы. Партыя і ўрад надаюць гэтай кампаніі вельмі сур'ёзную ўвагу. З 10 лістапада па 10 сьнежня г. г. ЦК КП(б)Б быў абвешчаны месячнік загатоўкі тэхкультур.

Аднак, ня гледзячы на гэта ў галіне загатовак тэхкультур да апошняга часу няма яшчэ належнага пералому. На 10 сьнежня, паводле вестак Наркамснабу, плян загатовак па лёнавалакну выканан толькі на 26,8 проц., семя—55,2 проц., пянькі—2,7 проц., канапель—14,1 проц. Паміж апрацоўкай і здачай (продаж) тэхкультур дзяржаве наглядаецца вялікі разрыў. На гэты тэрмін, па вестках НКЗ памята лёну 41 проц. заданьня патрапана лёнавалакна—22,3 проц., канапель памята—15,4 проц., пратрапана пянькі 3,8 проц.

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб тым, што гатовую прадукцыю не здаюць на загатоўчыя пункты, што зьяўляецца недапушчальным зьявішчам.

Але побач з гэтым некаторыя раёны і калгасы праявілі апартуністычную недаацэнку ў галіне апрацоўкі і здачы тэхкультур. У сёньняшнім нумары мы зьмяшчаем рад допісаў, якія характарызуюць яўна апартуністычныя адносіны кіраўніцтва калгасаў да справы апрацоўкі лёну. Калгас «Інтэрнацыянал», Жлобінскага раёну, апрацоўку лёну зацягвае: за 20 дзён апрацавана ўсяго 5 цэнт. валакна, мочаныя канопілі засталіся пад лёдам. Ня лепш абстаіць справа з апрацоўкай лёну і ў калгасе «Ленінскі шлях» Аршанскага раёну, дзе з 23 га лёну апрацавана толькі 5 цэнт., рэшта расцягваецца жывёлай.

Там, дзе вакол апрацоўкі тэхкультур мабілізавана грамадзкая думка, там мы маем ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянавых заданьняў. Так, калгас імя Сталіна, Заслаўскага раёну ў гонар 2 Сэсіі ЦВК БССР, арганізаваў чырвоны абоз з лёнавалакном. Талачынскі сельсавет да гэтага часу выканаў 50 проц. лёназагатовак, на 25 сьнежня сельсавет абавязаўся поўнасьцю закончыць апрацоўку лёну. Бальшавіцкія тэмпы ў апрацоўцы і здачы лёнавалакна паказваюць Камсініцкі і Александрыйскі сельсаветы, Шклоўскага раёну, якія перавыканалі пляны па лёназагатовак.

Трэба даць рашучы адпор усім апартуністычным разважаньням аб чарговасьці лёназагатовак. Усе калгасы, бядняцка-серадняцкія гаспадаркі павінны пераключыцца на ўдарнае правядзеньне апрацоўкі і здачы тэхкультур. Трэба браць прыклад з лепшых барацьбітоў за лён. Трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на кантроль выкананьня здачы лёну кулацка-заможнай часткай на цьвёрдых заданьнях. У дачыненьні да кулака трэба прыняць самы жорсткі нажым, прымусіць кулака неадкладна здаць лён па цьвёрдым заданьні.

У гонар сэсіі ЦВК—чырвоны абоз з лёнавалакном

Заслаўе. 13 сьнежня калгас імя Сталіна, Траскаўскага сельсавету ў гонар II сэсіі ЦВК БССР, арганізаваў чырвоны абоз з лёнавалакном. На менскую лёнабазу здадзена 40 цэнт. добраякаснага валакна.

Фушэр.

„Калі лён крыху пагсеццабяда не вялікая“—так разважае старшыня калгасу Васіленка

ВОРША. (Наш кар.). Калгас «Ленінскі шлях», Шыбецкага сельсавету, злосна адцягвае апрацоўку лёну. Калгас сёлета засеяў 23 га лёну, але да гэтага часу апрацаваў толькі 5 цэнт. Астатні лён часткова гніе, бо быў складзены мокрым, часткова складзены пад паветкай і расьцягваецца жывёлай.

На заўвагі калгасьнікаў, што лён трэба хутчэй апрацаваць, каб ён не псаваўся, старшыня калгасу Васіленка адказвае: «А калі лён крыху пагсеццца—бяда не вялікая».

Так, дзякуючы злачынным адносінам праўленьня калгасу «Ленінскі шлях» зрываецца апрацоўка і здача лёну дзяржаве. Між тым у калгасе ёсьць усе магчымасьці, каб апрацоўку і здачу лёну правесьці ўдарным парадкам. У калгасе ёсьць дастаткова рабочай сілы і дзьве лёнамялкі, якія зараз стаяць без работы.

А. Н

Рэкорд бязьдзейнасьці і апартуністычнага благадушша

Жлобін. (Наш кор.). Рэкорд бязьдзейнасьці, разгільдзяйства, апартуністычнага благадушша і злачынай недаацэнкі лёназагатовак пралвіў калгас «III Інтэрнацыянал», Сенажаткаўскага сельсавету.

Паводле пляну, калгас павінен здаць (прадаць) 20 цнт. валакна, на 11 сьнежня калгас здаў толькі 5,4 цнт.

Апрацоўка лёну пачалася з 21 лістапада. Брыгада створана невялікая і ня сталая. Работа праводзіцца ў адну зьмену і ня кожны дзень. Зьдзельшчына пры апрацоўцы лёну ня ўведзена. Старшыня калгасу тав. Архіпенка апартуністычна заяўляе: «Зьдзельшчыну на такой рабоце нельга ўвесьці».

Пры сучасных тэмпах работы, апрацоўку лёнавалакна магчыма будзе закончыць толькі праз 60 дзён (За 20 дзён апрацавана 5 цнт).

Райкалгассаюз павінен даць руйнуючы адпор апартуністычным адносінам кіраўніцтва калгасу «III Інтэрнацыянал» да апрацоўкі тэхкультур.

Закрэўскі.

Камсініцкі і Александрыйскі сельсаветы датэрмінова выканалі плян лёназагатовак

ШКЛОЎ. Камсініцкі і Александрыйскі сельсаветы пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных ячэек па баявому правялі месячнік апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур. Была праведзена растлумачальная работа сярод калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў аб задачах сваячасовай апрацоўкі і здачы (продажу) лёну дзяржаве. У выніку гэтага Камсініцкі і Александрыйскі сельсаветы датэрмінова выканалі плян лёназагатовак.

Так, Александрыйскі сельсавет плян загатовак тэхкультур па калгасным сэктары выканаў на 105 проц. і па аднаасобным на 85 проц., Камсініцкі сельсавет па аднаасобным сэктары плян выканаў на 102 проц., па калгасах на 89 проц.

Перадавыя сельсаветы Шклоўшчыны павінны быць прэм'яваны.

Р. Баравік.

Закончыць апрацоўку лёну да 25 сьнежня—абавязаўся Талачынск сельсавет

Талачын. На 13 сьнежня Талачынскім сельсаветам плян лёназагатовак выкананы на 52 проц. Па сельсавеце абвешчаны дэкаднік па апрацоўцы лёну. Да 25 сьнежня сельсавет абавязаўся цалкам закончыць апрацоўку лёну.

Усе калгасы ўключыліся ў дэкаднік. Арганізаваны спэцыяльныя брыгады. Паміж калгасамі і паасобнымі брыгадамі заключана сацспаборніцтва на хутчэйшае сканчэньне апрацоўкі і выпуск лепшай прадукцыі.

Любчанскі.

—УКЛЮЧЫМСЯ У КОНКУРС—

НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЛЯСНОЙ ЭСТАФЭТЫ

Газэта „Лесной Рабочий“ абвясьціла конкурс на лепшае правядзеньне лясной эстафэты і выклікала нас на асьвятленьне вопыту вербоўкі рабочай і гужавой сілы на лесазагатоўках СССР

Шматтыражкі, насьценгазэты, лескоры, уключайцеся ў конкурс, дапамагайце леспрамгасам вербаваць рабочую сілу на лесазагатоўкі і лесавывазкі

Па-баявому правесьці лясную эстафэту

Праведзеная ў мінулым годзе «Савецкая эстафэта» дала вялізарнейшыя вынікі ў перавыбарачай кампаніі саветаў.

Як адзін з лепшых мэтадаў згуртаваньня актыву, яна ўвойдзе ў гісторыю барацьбы саветаў за выкананьне дырэктыў партыі — за будаўніцтва сацыялізму.

Эстафэта зьяўляецца адным з сродкаў мабілізацыі грамадзкасьці на выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

Ганебныя лічбы выкананьня пляну лесазагатовак (39 проц. па будаўнічай і 9,5 проц. па дровах) і вывазкі (6,5 проц. і 9,5 проц. на 1-XII) патрабуюць згуртаваньня найбольшай увагі ўсёй грамадзкасьці вакол прарываў з мэтай хутчэйшай іх ліквідацыі.

Усесаюзны штаб садзейнічаньня лесазагатоўкам арганізаваў лясную эстафэту. Наш Беларускі штаб садзейнічаньня даў старт эстафэце па БССР.

Перадавы атрад бальшавіцкай моладзі — камсамол, ужо падхапіў лясную эстафэту і на маладых сваіх плячох энэргічна панёс яе ў рабочыя масы—лесарубаў.

Поруч з разгорнутай барацьбой за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў», лясная эстафэта набывае ў нашых умовах вялізарнейшае значэньне.

Тры маршруты лясной эстафэты—гэта тры галоўнейшыя этапы бальшавіцкага змаганьня за ліквідацыю прарываў, за пасьпяховае выкананьне дро валесазагатоўчых плянаў 4-га кварталу трэцяга рашаючага году.

Першы маршрут, які праводзіцца з 15 па 25 сьнежня — групуе ўвагу вакол вярбоўкі рабочай і гужавой сілы, арганізацыі працы на лесазагатоўках, падрыхтоўка і работа лежнявых дарог, вузкакалеек і г. д.

Тут ёсьць дзе разгнацца. Праверка дзейнасьці вярбовачнага апарату, стварэньне сталых кадраў, арганізацыя брыгадных мэтадаў, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, становішча лежнявых дарог, лесамэханізацыя—усё гэта вострыя пытаньні, ад іх непасрэдна залежыць выкананьне плянаў лесазагатовак.

Другі маршрут, які будзе праведзены з 25 сьнежня па 5 студзеня — ідзе па шляху праверкі: становішча ўласнага лесбелаўскага транспарту, забесьпячэньня яго прадфуражом, работы лясной каапэрацыі, забесьпячэньня лесарубаў прадуктамі і прамтаварамі. Гэты шлях найбольш цярністы і для таго, каб яго палепшыць, трэба вылучыць сюды найбольш здольных таварышоў. Гаспадарчы разьлік, прагрэсыўна-прэм'яльная аплата працы, гібкасьць органаў забесьпячэньня, іх уменае манэўраваньне фондамі, разьмеркаваньне і выдаткаваньне прамтавараў, падбор асортымэнтаў, разгортваньне сеткі сталовак і прыгатаваньне стравы ў іх,—вось за што павінны будуць узяцца ўдзельнікі эстафэты па гэтым маршруце.

Трэці маршрут — заключны этап эстафэты, які сустракае: культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых, ажыцьцяўленьне адзінага пляну культработы на лесазагатоўках, разгортваньне палітмасавай працы і г. д.

На гэтым этапе трэба выявіць наколькі партыйна - камсамольскія арганізацыі выканалі дырэктыву партыі аб палітмасавай працы ў лесе, наколькі яны ўмацавалі лесарабочкомы лепшымі кадрамі працаўнікоў, як прафсаюзныя органы перабудаваліся ў напрамку сапраўднага культурнага абслугоўваньня лесарубаў, ці дастаткова леспрамгасы, сумесна з прафсаюзам, вялі барацьбу за палепшаньне матар'яльна - бытавых умоў сталых кадраў; і шмат іншых пытаньняў, якія робяць вялізарнейшы ўплыў на ход леса загатовак і вывазку.

Вакол гэтых трох маршрутаў павін на быць мабілізавана ўвага ўсіх рабочых - лесарубаў і тэхнэрсаналу, калгасьнікаў і ўсяго вясковага актыву.

Шляхам праверкі як канкрэтна прамляецца праца ў даным вучастку і як выконваюцца нашы задачы павінны быць выраўнаны ўсе вузкія месцы, выяўлены лепшыя і горшыя працаўнікі, узьнята на вышэйшую ступень інициятыва рабочых і тэхнэрсаналу — па рацыяналізацыі і мэханізацыі. Адстаючыя галіны працы павінны быць узяты на грамадзкі буксір і дасягнута найбольшая дапамога мясцовых органаў—лесазагатоўкам. Увесь апарат леспрамгасаў павінен заняць першае месца ў баёх на лясным фронце.

Арганізацыяй скразных ударных брыгад па ўсіх працэсах лесазагатоўкі і вывазкі, шырокім разгортваньнем паліткі - масавай працы, найбольшым ажыцьцяўленьнем сацспаборніцтва—павінен быць даны рашучы адпор клясаваму ворагу, што шкодзіць лесазагатоўкам.

Усе раённыя кіруючыя арганізацыі павінны кінуць лепшыя свае сілы на пасьпяховае правядзеньне лясной эстафэты.

У мэтах найлепшага правядзеньня лясной эстафэты, Усесаюзным штабам садзейнічаньня абвешчаны конкурс. За дача конкурсу — спаборніцтва: садзейнічаць мабілізацыі ўсіх рабочых, адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, усёй грамадзкасьці леспрамгасаў і мясцовых партыйна - савецкіх арганізацый — на ўдарнае правядзеньне лясной эстафэты.

Правядзеньнем па ўдарнаму лясной эстафэты забясьпечыць 100 проц. выкананьне лясного прамфінпляну — рашаючага году пяцігодкі.

Друкарня імя Сталіна прыступіла да работы па калдагаворнай

Калдагаворная кампанія па друкарні імя Сталіна разгортваецца. Усе цэхі памячаюць пляны работы па праверцы старога калдагавору. Створана агульна-заводская часовая канфліктная камісія. Па цэхах таксама створаны цэхавыя камісіі. Вакол канфліктных камісій групуецца добраахвотны актыў, які складаецца ў самаправерачныя брыгады.

Гэтыя брыгады будуць весьці работу па праверцы ўсіх пытаньняў калдагавору. Каб ня было блытаніны ў працы і ўсе брыгады працавалі плянавана, камісія выпрацавала ў дапамогу брыгадам спэцыяльны пытальнік. Так, бярэцца адно пытаньне прамфінплян. Гэты аддзел падзяляецца на рад дапаможных пытаньняў і даецца брыгадзе. Такім чынам, брыгада кіруючыя пытальнікам, ахапляе ўсё і цалкам гэта цэнтральнае пытаньне.

Пасьля ўвесь матар'ял будзе разгледжаны па цэхпрафкамітэце, дзе будзе пастаўлены даклад загадчыка цэху.

Паступіўшы ў заводзкую камісію матар'ял ад цэхаў—будзе абагулены і зроблены агульны вынік выкананьня калдагавору бакамі. Гэты матар'ял будзе разгледжаны на агульна-заводзкай канфэрэнцыі.

Па друкарні разгортваецца таксама і тарыфная работа. Да новага калдагавору ў галіне тарыфізацыі будзе падрыхтаваны рад вытворчых новых пытаньняў.

Шматтыражка «Друкарская праўда» рыхтуе рэйд па аглядзе выкананьня калдагавору.

Шэмпель.

КАМГАС І ГАРЖЫЛСАЮЗ павінны даць тлумачэньні па гэтай справе

Менск. У гэтым годзе па ізвозной вуліцы пабудаваны пасёлак у шэсьць дамоў, заселены пераважна рабочымі з прадпрыемстваў. Гаспадаром гэтых дамоў зьяўляецца Менкамгас, які прыняў ад Гаржылсаюзу пасёлак з шматлікімі недаробкамі:

некаторыя дамы не прабіты і вецер прадуває сьцены наскрозь;

акніцы не навешаны, яны валяліся на дварэ і расьцягваліся кім павала;

скляпы не падзелены перагародкамі, а зьяўляюцца агульным для двух кватэр.

студня пасьля месячнага карыстаньня патрабавала рамонту, на які жыльцы затрацілі ўласных сродкаў каля сотні рублёў.

тратуары не пакладзены і гразь у пасёлку ўвосень была непраязная;

вулічнага асьвятленьня няма. Такі ганебны факт нельга абыйсьці моўчкі.

Увосень мінулага году быў выведзен фундамант пад сёмы дом, меўся ўвесь матар'ял на пабудову гэтага дому, але Гаржылсаюз яго не пабудаваў, а матар'ял (бярвеньні і дошкі) пайшоў на пабудову скляпоў жыхаром Мільким, Карнейка і Давідовічам, частка-ж матар'ялу спалена.

Кіраўнікі Менкамгасу аб усім гэтым ведалі, але ніякіх мер ня прымалі і вінаватых да адказнасьці ня прыцягнулі.

Адпаведным органам трэба расьледаваць гэтую справу.

В.

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ

Арганізавана набіраць рабочых-лесарубаў

Плян па загатоўцы дзелавой драўніны на і сьнежня ў БССР выкананы на 39,7 проц. квартальнага заданьня. Па загатоўцы дроў — 43 проц., вывезена з лесу да чыгуначных і сплаўных пунктаў дзелавой драўніны — 6,5 проц. квартальнага заданьня. Дроў — 9,5 пр.

Галоўная прычына прарыву ў дрова лесазагатоўках і лесавывазкі ў 4 квартале заключаецца ў адсутнасьці дастатковай колькасьці рабочай і гужавой сілы.

На выкананьне заданьня 4 кварталу патрэбна было з кастрычніка месяца мець штодзенна ў лесе 25.939 чал. лесарубаў і 132.031 конных падвод, але да заключэньня дагавораў прыступілі толькі ў лістападзе. На 1-XII ужо заключана дагавораў з 54.295 чалавек (з іх 35.982 калгасьнікаў) лесарубамі і завербавана 49.532 конападводы, з іх 43.303 калгасных. Лічбы быццам паказваюць вялізарнае дасягненьне, але справа ў тым, што гэтыя лічбы зьяўляюцца паперовымі. Фактычна ў кастрычніку працавала каля 5 проц. гэтай колькасьці, а ў лістападзе 15 пр. лесарубаў і 4 проц. возчыкаў. Толькі ў першых лічбах сьнежня працуе нібыта каля 20.000 чалавек лесарубаў і 8.000 возчыкаў. Завербаваная колькасьць рабочай і гужавой сілы арганізацыйна не замацавана.

Пастановы ЦК і СНК у калгасах і паселішчах прапрацаваны недастаткова. Сяляне ня ведаюць ні ільгот, ні ўмоў працы, у заключаных дагаворах не зазначаны выстаўляюцца абавязкі абодвых бакоў.

Горацкі леспрамгас спадзяецца выключна на міліцыю, якая «выгане» яму падводу, а Чырвонапольскі леспрамгас «заключыў» дагаворы з адназасобніка мі, прадугледзеўшы 25 проц. няўстойкі (!??) пры невыкананьні ўмовы.

Адсутнасьць брыгаднага мэтаду працы

На 1-XII сталых кадраў быццам завербавана 7.736 чал. Гэта значыць, што дырэктыўная лічба перавыкананa! Адна, бяда ў тым, што гэтыя кадры не зьяўляюцца сталымі. Паводле вестак райлесгасаў, лічыцца пераведзенымі на брыгадныя мэтады працы толькі 24 проц. (дырэктыва ЦК і СНК была аб пераводзе 75 проц. да 1-XII).

Пераход на брыгадныя мэтады працы натыкаецца на сьцяну апартуністаў, прыходзіцца прэмагаць кансэрватызм самога тэхнічнага пэрсаналу. Часта прыходзіцца чуць такія разважаньні, што «калі ўвядзем брыгадны спосаб, дык прыдзецца мець дзясятнікам, сваіх «ад'ютантаў» для ўліку працы». І шмат іншых гутарак.

Лепш за ўсё разгорнута работа па арганізацыі брыгад у Аршанскім, Быхаўскім і Клімавіцкім раёнах. Быхаўскі райлесгас ужо на 60 проц. працуе брыгаднымі мэтадамі. Клімавіцкі дамогся перавыкананьня нормаў выпраўкі ў брыгадах і наладзіў вывучэньне вытворчых працэсаў па хранамэтражы. Аршанскі леспрамгас арганізаваў 5 жаночых брыгад на лесазагатоўках.

Прафсаюзы ў баку ад лесазагатовак

Саюз лесдрэў і райпрафсаветы не мабілізавалі грамадзкасьць на бальшавіцкае змаганьне за выкананьне пляну. Рабочкомы не павярнуліся тварам да вытворчасьці і не адчуваюць на сабе адказнасьці за прарывы.

Ня вельмі турбуюцца рабочкомы і пытаньнем лесамэханізацыі. Правядзеньне апошняга натыкаецца на поўны кансэрватызм.

У Рэчыцкім леспрамгасе маторныя пілы «почивают на лаврах», толькі таму, што ім не надаюць асаблівага значэньня. Лежневыя дарогі працуюць у асноўным здавальняюча (Рэчыца), але несваячасова забясьпечваюцца тралёўкай, дзякуючы чаму ёсьць перабоі ў рабоце (Чэрыкаў). Пры сапраўдным разгортваньні палітмасавай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва гэтыя не дахопы маглі быць зьнішчаны. Нажаль, пералому ў гэтым напрамку яшчэ не адчуваецца.

Узорныя прыклады камсамолу

Камсамол заняў перадавыя пазыцыі ў барацьбе за лясную пяцігодку. У большасьці раёнаў камсамольскія арганізацыі, пасьля дырэктывы ЦК ЛКСМБ, выраўнілі «вузкія» месцы і зьявіліся застрэльшчыкамі работы ў лесе.

Камсамол Бабруйшчыны нядаўна вылучыў на дапамогу леспрамгасу 15 лепшых камсамольцаў і ўзяў на сябе абавязак адгрузіць Менску камсамольскі эшалён дроў.

Камсамол Рагачэўскага раёну ўмацаваў леспрамгасы лепшымі сіламі.

Камсамольскія арганізацыі Віцебску, Воршы, Клімавічы і рэду іншых раёнаў, па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне дырэктыў партыі.

Т—а.



Вывазка дроў па ляжнёвай дарозе.

БССР уключылася ва ўсесаюзную лясную эстафэту

Фарсаваць вывазку апалу і лесаматар'ялаў

Загатоўка лесу, вывазка яго, а так сама вывазка дроў і торфу праходзяць нездавальняюча. Праграма чаць вёртага кварталу на 1 сьнежня знач на недавыканана. Загатоўка будаўнічага лесу выканана на 40,7 проц., дроў—на 43,5 проц. Праграма па вывазцы дроў выканана ўсяго на 9,6 проц., лесаматар'ялаў—на 6,6 проц. і торфу—на 23 проц.

Створаны пастановай ЦК КП(б)Б усебеларускі штаб садзейнасьці лесазагатоўкам і вывазцы апалу парашыў на сваім паседжаньні 13 сьнежня ўключыцца ва ўсесаюзную лясную эстафэту і абвясьціць па БССР тры асноўныя маршруты. У задачы маршрутаў уваходзіць—поўнае забесьпячэньне лесазагатовак і вывазкі рабочай і гужавой сілай, г. зн. выкананьне пастановы Наркампрацы і Калгасцэнтру аб прыцягненьні да вывазкі лесу і торфу шляхам арганізацыі калгасных абозаў, 65 тыс. фурманак штодзённа; укараненьне брыгадных мэтадаў работы, пабудова драўляных і лежнявых дарог, рамонт інвэнтара і інструмэнтаў, паляпшэньне тэхнікі бясьпечнасьці, укараненьне зьдзельна прэм'яльнай аплаты працы, матар'яльна-бытавое і культурнае абслугоўваньне рабочых і г. д.

Раённым штабам садзейнасьці прапанавана распрацаваць канкрэтныя пляны ажыцьцяўленьня задач гэтых маршрутаў.

Усебеларускі штаб лічыць неабходным прымацаваць больш буйныя заводы БССР да рашаючых леспрамгасаў і торфазаводаў і пасланць на лесазагатоўкі і вывазку рабочыя брыгады. Для дапамогі мясцовым арганізацыям і рабочым брыгадам усебеларускі штаб пастанавіў мабілізаваць адказных работнікаў: Наркампрацы—15 чал., Лесбел—20 чал., Белторф—15 чал., Нар. Кам. Аховы Здароўя—15 чал., Галоўсацстрах—15 чал., Наркамасьветы—10 чал., Белкаапсаюз—15 чал. Перад ЦК ЛКСМБ таксама пастаўлена пытаньне аб мабілізацыі 30 камсамольцаў для гэтай-жа мэты.

Для заахвочаньня раённых леспрамгасаў, вучасткаў, калгасаў, брыгад і паасобных работнікаў пастаноўлена стварыць спэцыяльныя прэм'яльныя фонды пры Лесбеле і Белторфе, прычым прэміі павінны выдавацца па заключэньнях цэнтральнага і раённых штабаў садзейнасьці.

Рагачэўскі раён павінен крута ўзьняць тэмпы збожжазагатовак

Рагачэўскі раён на 11 сьнежня заданьне па загатоўках збожжа выканаў толькі на 59,8 проц. Пры гэтым асабліва адстаюць калгасы, якія заданьне па загатоўках выканалі ўсяго на 48,1 проц. у той час як аднаасобны сэктар выканаў на 66,2 проц. Другая пяцідзёнка сьнежня ў галіне збожжа загатовак дала зрух толькі на 0,7 пр.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што значная частка сельсаветаў і партыйных ячэек Рагачэўшчыны барацьбе за сваячасовае і поўнае выкананьне загатоўчых плянаў не надалі яшчэ належнай увагі, не мабілізавалі шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў на поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну збожжазагатовак.

Азярынскі сельсавет плян збожжазагатовак на 11 сьнежня па калгасным сэктары выканаў на 45 проц., а па аднаасобным сэктары на 48,9 проц. Збожжазагатоўкі тут праходзяць літаральна самацёкам. У канцылярыі сельсавету няма нават загатоўчых плянаў, таксама, як і не вядзецца ўліку выкананьня кулакамі і заможнікамі цьвёрдых заданьняў. Сакратар сельсавету Янаў замест выкананьня загатоўчых плянаў п'янствуе.

Станькаўскі сельсавет адстае яшчэ больш. Заданьне па збожжазагатоўках па калгасным сэктары сельсавету выканана на 25 проц., па аднаасобным на 23 проц. Прыбарсні—па калгасным сэктары—на 17 проц., па аднаасобным—на 38 проц.

Між тым паасобныя сельсаветы ў выніку рашучага змаганьня за збожжа дабіліся бліскучых посьпехаў у выкананьні пляна збожжазагатовак. Доўскі сельсавет па аднаасобным сэктары плян загатовак збожжа выкалаў на 98,1 проц., па калгасным—на 112 проц. Запольскі—па аднаасобным сэктары—на 106 проц., Крушынаўскі па калгасным сэктары на 146 проц., па аднаасобным на 81 проц.

Саўгасы раёну, якія павінны быць у першых радох барацьбіту за выкананьне збожжазагатовак, ганебна адстаюць. Так, саўгасы: «Турск», «За балоцьце», «Красьніца» да гэтага часу яшчэ не здалі ніводнага цэнтнера збожжа дзяржаве. Толькі 2 саўгасы—«Дзедлава» і «Ціхінічы» да 10 сьнежня поўнасьцю выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы збожжа.

Рагачэўскі раён павінен крута ўзьняць тэмпы загатовак з тым, каб у бліжэйшыя дні ліквідаваць сваё ганебнае адставаньне. Месьніцкія тэндэнцыі паасобных калгасаў і саўгасаў павінны атрымаць бальшавіцкі адпор.

Ян. Клімовіч.

Дзе хдэкаднік барацьбы за ліквідацыю няпісьменнасьці

У 1932 г. БССР павінна стаць суцэльна-пісьменнай

Няма зруху ў ліквідацыі няпісьменнасьці

Па Крупскім сельсавеце і местсавеце на пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці не зьвярнулі належнай увагі. З 518 няпісьменных на 14-XII-г г. наведваюць ліквпункты 37,8 проц. У паасобных вёсках і калгасах амаль зусім не праводзяцца заняткі: (Бярозаўка, Слабада, Новая Крупка, Чырвоная Горка, Масьлёнка, м. Крупкі і інш.).

Па іншых ліквпунктах заняткі таксама праводзяцца нерэгулярна. У в. Шырневічы настаўнік Зьмітровіч сыстэматычна зрывае работу ліквпункту і часткова заняткі дзённай школы. Сельсавет ня прымае ніякіх захадаў да такіх дэзарганізуючых адносін у рабоце ліквпунктаў і школы.

Настаўніца Соскінд, прымацаваная да ліквпункту в. Слабада, ужо больш 2-х месяцаў не праводзіць ніякай работы.

Партыйная камсамольская і прафсаюзныя арганізацыі ігнаруюць дырэктывы партыі аб ператварэньні Беларусі ў краіну суцэльнай пісьменнасьці да мая 1932 году.

Крупскім сельсавет і местсавет апартуністычна адносяцца да ліквідацыі няпісьменнасьці і аб разгортваньні яе не клапоцяцца. Культкамісіі ня ўцягнуты ў работу.

Крупскі сельсавет і местсавет, «партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі павінны мабілізаваць усю ўвагу на ліквідацыю прарываў на фронце ўсеагульнага навучаньня і забясьпечыць кадрамі ліквідатараў тыя ліквпункты, якія і дагэтуль не пачалі сталай работы.

Ударнік.

Уключыліся ў двухдэкаднік

Сянно. (Наш кар.). Пытаньню ператварэньня БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці не надана належнага значэньня ў Сененскім раёне.

Прафсаюзная, камсамольская і інш. грамадзкія арганізацыі недаацэньваюць справы ліквідацыі няпісьменнасьці. У выніку гэтага работа па ліквідацыі няпісьменнасьці праходзіла самацёкам. Ліквпунктамі і школамі малапісьменных па раёне ахоплена толькі 53,4 проц. Такая лічба яскрава гаворыць аб нядбайнасьці да справы ліквідацыі няпісьменнасьці.

Новасельскі сельсавет м. 2 і Сідарніцкі ліквідацыю няпісьменнасьці сарвалі, ліквпункты не працуюць. У Хадчанскім сельсавеце ахоплена ліквпунктамі 24 проц., у Новасельскім № 1—25 проц., Аляксеніцкім — 34,7 проц., Пустынскім — 40 і г. д.

Некалькі лепш абстаіць справа ў Расьнянскім сельсавеце, дзе ахоплена ліквпунктамі 98 проц. і ў Застадольскім—90.

Раённы савет т-ва «Прэч няпісьменнасьць» існуе толькі на паперы, ніякай работы не праводзіць.

Па ўключэньні ў двухдэкаднік барацьбы па ліквідацыі прарываў, пачаўся зрух. РКК-РСІ, прафарганізацыі і камсамол заняліся стала справай ліквідацыі няпісьменнасьці.

Старшыня Новасельскага сельсавету № 2 за зрыў ліквідацыі няпісьменнасьці прыцягнуты да адказнасьці.

Б. Зяневіч.

Зрабіць пералом у ліквідацыі няпісьменнасьці

Менск. 4-XII. (Белта). На апошнім паседжаньні калегіі Наркамасьветы былі заслуханы даклады Гомельскага, Кармянскага, Дрысенскага, Сураскага, Чуваскага інспэктароў палітасьветы і даклад палітасьвет груп НКА аб ходзе работы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Калегія Наркамасьветы адзначыла, што ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці па БССР ёсьць значны прарыў. На 20 лістапада г. г. ахоплена ліквпунктамі толькі 61,4 проц. няпісьменных і 54 проц. малапісьменных. Найбольшыя прарывы ў гэтай рабоце ў наступных раёнах: у Кармянскім—13 проц., Дрысенскім—23 проц., Чавускім — 20 проц. і Сураскім—30,2 проц. Прычына гэтых ганебных фактаў крыецца ў тым, што кіраўніцтва памянёных раёнаў ня здолела мабілізаваць шырокую грамадзкасьць, недаацаніла палітычнай важнасьці справы ліквідацыі няпісьменнасьці, інспэктура палітасьветы і нарасьветы праявіла поўную бязьдзейнасьць і праваапартуністычную стаўку на самацёк.

У зьвязку з гэтым калегія паставіла зьняць з работы Кармянскага інспэктара палітасьветы і справу аб зрыве работы накіраваць у суд для прыцягненьня да адказнасьці. Чавускага інспэктара палітасьветы папярэдзіць, каб аношні зараз-жа прыняў рашучыя мерапрыемствы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

За суцэльную ліквідацыю няпісьменнасьці

У Броскім сельсавеце, Бабруйскага раёну, у гэтым годзе павінны працаваць 9 ліквпунктаў, але на 5 сьнежня адкрыта толькі 5 ліквпунктаў і тыя аб сталяваньнем і падручнікамі не забясьпечаны.

Пытаньне суцэльнай пісьменнасьці толькі гэтымі днямі абгаворана на пашыраным пленуме сельсавету і заключаны сацдагавор паміж Броскім і Прозьдзінскім с. с. на поўнае скасаваньне няпісьменнасьці да мая 1932 году.

Лос П.

Любанскі раён у паласе прарываў

Пастановы партыі і ўраду па пытаньні ўсенавучу на сёньняшні дзень ня выкананы. З прычыны апартуністычных адносін да гэтай справы Любанскі раён апынуўся ў паласе прарываў на фронце ўсенавучу.

Палітэхнізацыя ў жыцьцё не праводзіцца. Рабочыя куткі і майстэрні не абсталяваны.

Ліквідацыя няпісьменнасьці разгорнута зусім слаба. Няма дакладнага вучоту, колькі чалавек наведваюць ліквпункты.

Мэтадычнае кіраўніцтва з боку інспэктарыяту і мэтбюро адсучнічае. замест таго, каб накіраваць на курсы раймэтадыстаў 2 чал. з раёну, РВК накіраваў аднаго.

Настаўнік.

Ліквідацыя няпісьменнасьці ў саўгасе „10-годзьдзя БССР“

У саўгасе «10-годзьдзе БССР» работа па ліквідацыі няпісьменнасьці зусім не праводзіцца. У саўгасе 80 чал. рабочых няпісьменных і малапісьменных, а ліквпункты наведваюць 10—15 чал. ды і то не заўсёды.

Партячэйка, рабачком, адміністрацыя і асьветнікі справу ліквідацыі ня пісьменнасьці ігнаруюць. На іх думку гэта — дробязь.

Такую апартуністычную стаўку на самацёк трэба выбіць з галоў кіраўнікоў саўгасу. Справу ліквідацыі няпісьменнасьці трэба паставіць на баявыя рэйкі, бо ў саўгасе «10-годзьдзе БССР» ёсьць усе ўмовы для таго, каб дасягнуць гэтага.

У саўгасе ёсьць такія навучальныя ўстановы, як рабфак, саўгасвуч, школа І канцэнтру і інш. Трэба, каб партыйныя і камсамольскія арганізацыі па-сапраўднаму накіравалі ўсе асьветніцкія сілы на ліквідацыю няпісьменнасьці. Гэтая спадчына мінулага павінна быць зьнішчана.

Свой.

18 мясцкомаў не далі весткі аб няпісьменнасьці

Па мясцкомах Жлобінскага раёну назіралася поўная недаацэнка работы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Амаль нідзе ня выконвалася пастанова 10 зьезду чыгуначнікаў аб ліквідацыі няпісьменнасьці сярод апошніх і іх утрыманцаў. З ліку 48 мясцкомаў райпрафсач агрымаў весткі аб ліку няпісьменных і малапісьменных ўсяго ад 30 мясцкомаў. Зусім няма вучоту няпісьменных і малапісьменных у мясцкомах станцый Бабруйск, Быхаў, Рудзенск, Міханавічы, Ст. Дарогі, Слуцак, Асіпавічы.

Весткі 30 мясцкомаў гавораць, што ў іх ёсьць 240 няпісьменных і 645 малапісьменных.

Прэзыдыум Райпрафсачу даў ацэнку гэтай апартуністычнай бязьдзейнасьці мясцкомаў. З 20-га лістапада абвешчаны месячнік праверкі становішча ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці па раёне. Пры кожным мясцкоме павінен быць арганізаваны ліквпункт і яч. «П. Н.». І гэта дало свае вынікі.

Наперадзе ідзе мясцком шляху ст. Жлобін. Ён арганізаваў тры ліквпункты, ячэйку «П. Н.» з 120 чал. Праведзена 12 гутарак у арцелях і зьменах аб мэтах і задачах месячніку.

Прыблізныя вынікі мае і мясцком руху ст. Жлобін: арганізавана ячэйка «П. Н.», праведзены гутаркі ў зьменах, 107 членаў саюзу ўступіла ў ячэйку «П. Н.».

Разгортвае работу мясцком ст. Быхаў. З 28 малапісьменных, ахоплена вучобай 18.

У астатніх мясцкомах работа не праводзіцца.

Райпрафсач яшчэ з большай увагай павінен праверыць работу, якая ўскладзена партыяй і ўрадам.

Ташын.

У саўгасе „Лекерта“ няма ліквпункту

З пачатку навучальнага году прайшло шмат часу, але за ліквідацыю ня пісьменнасьці ў саўгасе «Лекерта» зусім яшчэ ня браліся. У саўгасе «Лекерта» — у трох яго аддзяленьнях (Людамант, Весялоўка і Вясьнінка) налічваецца 150 малапісьменных і звыш 80 чалавек зусім няпісьменных. У мінулым годзе працавала 2 ліквпункты, а ў гэтым годзе ніводнага. З боку Менсельсавету, рабачкому і партыйнай ячэйкі нічога ў гэтым напрамку ня робіцца. Старшыня рабачкому таварыш Моніч і сакратар партыйнай ячэйкі т. Мяц чакаюць з гораду ліквідатараў у той час, як ёсьць 120 вучняў школы саўгасвучу, якія могуць гэтай справай заняцца, але Моніч і Мяц на гэта не згаджаюцца. Падручнікі ёсьць, ліквідатараў можна знайсьці на месцы, але гэтай справай ніхто ня хоча заняцца.

Камсамольскі калектыў саўгасу і ячэйкі ЛКСМБ не жадаюць таксама заняцца справай барацьбы за суцэльную пісьменнасьць. Няпісьменныя і малапісьменныя павінны быць неадкладна пасаджаны за вучобу.

Н—ы.

Ліквідацыя няпісьменнасьці—забыты вучастка

Рагачэўск. Ліквідацыя няпісьменнасьці па гораздзе Рагачэўе апынулася ў недапушчальным становішчы. І гэта таму, што справай ліквідацыі няпісьменнасьці ня цікавяцца ні гарсавет, ні фабзаўкомы, ні мясцкомы.

Наведваньне ліквпунктаў няпісьменнасьці надзвычайна слабае. Так, на лесазаводзе імя Халтурына, ліквпункт наведвае толькі 50 проц. няпісьменных. Заўком лесазаводу ня прымае ніякіх да гэтага захадаў.

Пры гарадзкой сталовай (саюз кар чавікоў) ліквпункт наведвае толькі 1 проц. няпісьменных. Некаторыя з іх заяўляюць: «Буду плаціць штраф, а вучыцца ўсё-ж такі ня буду». Гэта сьведчыць аб тым, што мясцком саюзу харчавікоў не правёў сярод членаў свайго саюзу ніякай растлумачальнай работы аб значэньні ліквідацыі няпісьменнасьці.

На райкамбінаце, з наведваньнем ліквпункту яшчэ горш. На апошнія заняткі ліквпункту зьявіўся толькі 1 чалавек. Партячэйка і заўком камбінату — у баку ад такое важнае справы.

У працу ліквідацыі няпісьменнасьці па гораздзе ўцягнуты студэнты Рагачэўскага пэдтэхнікуму. Але трэба адзначыць, што да працы адносяцца дрэнна, на заняткі ідуць не падрыхтаванымі ў выніку чаго, якасьць апошняе нізкая.

Ёсьць шмат няпісьменных па горадзе, якія ня хочуць наведваць ліквпункты, і гарсавет ня прымае ніякіх да гэтага захадаў.

Рагачэўскі РайАНА павінен рашуча рэагаваць на факты апартуністычнай недаацэнкі справы ліквідацыі няпісьменнасьці.

Трэба дамагчыся таго, каб усе ліквпункты гораду працавалі як належыць.

Ал. Лугавы.

Чырвоны сьпіс

прадпрыемств датэрміновага скончыўшых прамфін лян трэцяга рашаючага

Жлобінскі лесазавод датэрміновага скончыў гадавую праграму да 10 сьнежня. Для будаўніцтва і экспарту расьпілована 17325 куб. мэтр. сыравіны пры 93 проц. затраце рабочай сілы, прадугледжанай плянам.

***

Рабочыя Салтанаўскага лесазаводу скончылі гадавое заданьне па расьпілоўцы.

***

За пасьпяховае і датэрміновае выкананьне прамфінпляну скураб'яднаньне асыгнавала 20.000 руб. чырвынаштандарнаму скузаводу «Бальшавік».

***

Магілеў. Фарматны цэх Магілеўскай сырамятнай фабрыкі на аснове бальшавіцкай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна 10 сьнежня закончыў свае гадавое заданьне па прамфінпляну з перавыкананьнем на 52,46 проц.

***

Абгаварыўшы пастанову ЦСПСВ аб падрыхтоўцы да праверкі калдагавароў Магілеўская рымарная фабрыка абвясьціла сябе ўдарнай па лепшай падрыхтоўцы да праверкі выкананьня калдагавароў і абавязалася да 19 сьнежня закончыць выкананьне прамфінпляну 1931 г.

Акупацыя тэрыторыі Кітаю японскім і французкім войскам

Японія рыхтуе глебу для далейшага захопу кітайскай тэрыторыі

ТОКІЁ. Японцы працягваюць паведамляць весткі аб дзейнасьці Чжан Сюэ-лянаўскага войска.

Паводле даных мукдэнскай ўлады Чжан Сюэ-лянаўскае войска быццам разбурыла чыгунку на вучастку Тунляо-Чжэн-цзяшунь, служачай гарантыяй японскіх пазык. Пагэтаму, паведамляецца далей, у гэты раён накіравана японскае войска. З Чаньчуня ў раён Сыпінгай-Таоаньскай чыгункі і ў раён Кунчунлюу таксама накіравана новае японскае войска.

Ня гледзячы на зьвесткі ўрадавых колаў аб адыходзе Чжан Сюэ-лянаўскага войска ў Паўночны Кітай, мукдэнскія крыніцы працягваюць сьцьвярджаць, што «няма ніякіх адзнак адыходу Чжан Сюэ-лянаўскага войска», хоць лічаць, што «становішча Чжан Сюэ-ляна робіцца небясьпечным, з прычыны падрыхтоўкі Хан Пу-чу (старшыня Шандуньскага правінцыйнага ўраду) выступіць у карысьць аньфуістаў.

Заўвага: Аньфу (рэакцыйная кітайская палітычная партыя) будучы пры ўладзе зьяўлялася энэргічным праваднікам японскага ўплыву, спрыяючы прасякненьню японскага капіталу ў Кітай. Рэзка варожая нацыянальна-рэвалюцыйнаму руху.

Французкае войска акупуе кітайскую тэрыторыю

Л�ЁНДАН, 16-XII. Згодна паведамленьня карэспандэнта газэты «Таймс» французкае войска з Інда-Кітаю, нібыта для прасьледваньня бандытаў, увайшло ў некаторыя пункты Паўднёвых правінцый Кітаю.

У Кантоне пануе вялізарны непакой у сувязі з гэтым выступленьнем французкага войска.

У Манчжурыі ў ваяж прыбываюць новыя японскія ваенныя часьці

ТОКІЁ 16-XII. З Мукдэну ўчора адпраўлены авіяцыйныя часткі для ўдзелу ў баёх у раёнах Цжэнцзянтуня.

***

ТОКІЁ, 16-XII. У Токіё прыбылі вайсковыя папаўненьні, якія адсылаюцца ў Манчжурыю для ўзмацненьня чыгуначных частак.

***

ШАНХАЙ, 16-XII. Сёньня ў Шанхай прыбылі два японскія крэйсары.

Далоў гамінданаўскіх катаў

ШАНХАЙ, 15-XII. Сёньня пасьля поўдня студэнты пакінулі будынак Нанкінскага аддзяленьня Гаміндану і павялі з сабой Чжан Мін-цю (старшыня выканаўчай рады) і Цзанюань-боя (старшыня спэцыяльнага камітэту па разбору спраў, зьвязаных з студэнцкімі выступленьнямі). Параненыя Чжан Мін-цю і Цзанюань-боя пасьля былі адпушчаны.

Аўдыторыя цэнт. камітэту Гаміндану зруйнавана студэнтамі. Арыштаваныя паліцыяй 5 студэнтаў былі вызвалены. Частка дэманструючых студэнтаў несла плякаты з лёзунгамі: «Няхай жыве кампартыя Кітаю», «Рабочыя і сяляне ўсяго сьвету злучайцеся». «Далоў нанкінскі ўрад».

Ман ўры крывавага вешаселя--Чак-Кай-шы

ШАНХАЙ, 16-XII. Адстаўка Чан Кай-шы прынята. У абежніку, які будзе неадкладна апублікаваны і перададзены па тэлеграфу для ўсеагульнага веданьня, паказваецца, што гэты крок прадпрымаецца ў інтарэсах нацыянальнага міру і аб'яднаньня для таго, каб забясьпечыць аб'яднаны фронт для барацьбы з японскай агрэсыяй ў Манчжурыі.

Агенцтва Гомін паведамляе, што Чан Кай-шы будзе запрапанаваны пост старшыні рады нацыянальнай абароны. Гэты пост будзе створаны на першай аб'яднанай нарадзе нанкінскага і кантонскага камітэтаў Гаміндану, прысьвечанай пытаньню рэарганізацыі ўраду і Гаміндану. Гэтая нарада адбудзецца ў наступным тыдні. Паводле новага праекту рэарганізацыі ўраду міркуецца, што выканаўчая рада будзе зьяўляцца урадам, а старшыня нанкінскага ўраду будзе ажыцьцяўляць вярхоўную ўладу.

Катарга для рабочых і сялян

ВАРШАВА, 15-XII. Акруговы суд у Ройне (Вальнь) прыгаварыў двух рабочых, абвінавачваных у арганізацыі ў 1918 г. «дывэрсыйнага» атраду—да 15 год катаргі кожнага:

У Валадзіцах (Кракаўскае ваяводзтва) суд прыгаварыў шэсьць рэвалюцыйных рабочых за арганізацыю ў мі г. г. дэманстрацыі беспрацоўных да розных тэрмінаў катаржнай турмы ад 1 да 5-ці год.

Узаканеньне паліцэйскага сакольля

ВАРШАВА, 15-XII. Польскае міністэрства юстыцыі распрацоўвае законапраект аб «адміністрацыйных пакараньнях», які прадугледжвае значнае пашырэньне правоў адміністрацыйных органаў.

Чарговае забойства рабочага з за-вугла

ВАРШАВА. 16-XII. У сувязі з правядзеньнем камуністычнай партыяй Польшчы «Дню барацьбы беспрацоўных», па ўсіх прамысловых цэнтрах беспрацоўныя сумесна з рабочымі, якія яшчэ заняты на вытворчасьці, дэманстравалі сваю гатоўнасьць і непахісную волю да барацьбы супроць ураду тэрору, голаду, беспрацоўя і вайны. У радзе гарадоў рабочыя вывешвалі чырвоныя сьцягі з камуністычнымі лёзунгамі.

Фашысцкі ўрад, а таксама і сацыял-фашысты, прыкладалі ўсе сілы, каб сарваць, но дапусьціць правядзеньне бангвога «Дня барацьбы беспрацоўных». Папярэдні ва ўсіх гаралох і прамысловых цэнтрах, і на вёсны, паліцыя ўчыніла шматлікія аблавы і арышты западозраных у рэвалюцыйнай дзейнасьці. У самы дзень паліцыя была прыведзена ў баявую гатоўнасьць і, ужываючы зброю, разганяла дэманстрантаў.

У Варшаве раніцою рабочыя вывешвалі чырвоныя сьцягі з заклікам да баявых рэвалюцыйных дэманстрацый. Калі на вуліцы Наліўкі рабочы Кохан нібыта ўзьнімаў чырвоны сьцяг, паліцэйскі агент застрэліў яго з-за вугла.

Гэта чарговае забойства з-за вугла ў фашысцкай Польшчы—невыпадковае, а зьяўляецца сыстэмай. Фашысцкі ўрад увеў палявыя суды, пакрыў Польшчу, Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну лесам шыбеніц. Але ня выратавацца польскаму фашызму. Пралетарская рэвалюцыя, якая набліжаецца шпаркім тэмпам зьнішчыць путы сацыяльнай і нацыянальнай няволі.

Рост беспрацоўя ў Польшчы

ВАРШАВА. 16-XII. Нават фашысцкі друк ня можа ўтаіць таго, што за апошнія часы наглядаецца значны скачок узросту беспрацоўя. Ва ўсіх галінах прамысловасьці, апроч вайсковай, штодня скарачаюцца сотні і тысячы рабочых і выкідаюцца на брук. Аб дапамозе беспрацоўным ня можа быць і гутаркі. Фашысцкі ўрад стварае так званыя «камітэты дапамогі беспрацоўным», якія маюць зьбіраць сродкі... ад галадаючых рабочых і ад тых-жа беспрацоўных. Безумоўна, што гэтыя «камітэты» зьяўляюцца чарговым зьдзекам фашысцкай улады над рабочымі і ні ў якім разе ня могуць аказаць нават мінімальнай рэальнай дапамогі.

У аднэй толькі Вільні налічваецца зарэгістраваных 6170 чал. беспрацоўных. Гэтая лічба далёка няпоўная. Яна не ахапляе нават чацьвертай часткі сапраўды маючыхся беспрацоўных. Аднак, з усёй армії беспрацоўных у Вільні атрымліваюць мізэрнейшую галодную дапамогу максімум 200-300 чалавек, а рэшта кінута на волю лёсу, засуджана на павольную гадоўную сьмерць.

Рэвалюцыйны фронт рабочай клясы сумесна з беспрацоўнымі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, штодня расьце і мацнее. Узьнімаюцца мільённыя масы на барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, за дыктатуру пралетарыяту, за савецкую Польшчу.

Г. Васільеўскі

У цяні шыбельніц

Глеба хістаецца пад нагамі польскага фашызму. Эканамічны крызіс пакрыў саванам беспрацоўя, горкай бядоты, голаду і холаду рабочыя кварталы гарадоў і вёскі. Эканоміка фашыцкай Польшчы, ня гледзячы на падскурнае ўпырскваньне французкіх банкаў. і ваенных канцэрнаў для падтрыманьня курсу злотага, развальваецца. У верасьні, напрыклад, у Польшчы вытапілена 30 тыс. тон чыгуна (двухдзённая работа нашых мэталюргічных заводаў) замест 86 тыс. тон сярэдня-месячнай вытапкі ў 1913 г.

Якое дасягненьне!

Бэльвэдэрскі сэйсмограф кожны дзень рэгіструе падземныя штуршкі нарастаючай рэвалюцыйнай барацьбы. Баромэтр паказвае буру! Польскі фашызм крывава распраўляецца з рэвалюцыйным рухам. Хроніка белага тэрору даўно ўжо не адзначала падобных зьверстваў. Масавыя арышты, каторжныя прысуды, дзікі рэжым у турмах. Пасьля ўсеагульнай галадоўкі, якая была зломана нязвычайнай лютасьцю, рэжым у польскіх турмах яшчэ больш пагоршыўся. У Кракаве, напрыклад, гэтымі днямі толькі ў турме сп. Міхаіла (богаўгодная турма!) турэмныя нагледчыкі, якія могуць канкураваць з мураўёўскімі вешальнікамі, зьбілі маладых работніц да паўсьмерці за тое, што яны патрабавалі кніг. Безабаронныя паліт зьняволеныя, якіх білі па твары, па грудзях, пасьля гэтай «апэрацыі» хварэюць крывёю і змагаюцца са сьмерцю. Гэта — не адзінкавы выпадак. У Пятроўскай турме забіты палітзьняволены Андрэй Вах, у Мыслоўскай турме (Дамброўскі вугальны басэйн) забіты палітзьняволены Якубоўскі і г. д. і да т. п.

Аднак, зьверствоў над зьняволенымі мала. Рэвалюцыйны жалезны паток прарывае ўсё гаці фашысцкага белага тэрору. Польскі фашызм спрабуе зараз адмежавацца ад рэвалюцыі дротавымі загародамі шыбельніц. Домны ў Польшчы загасаюць, ставяцца шыбельніцы! Вешаюць рэвалюцыйных рабочых, чыгуначнікаў, украінскіх, беларускіх і польскіх сялян. Вешаюць за забастоўкі, за барацьбу з абшарнікамі за падпалы панскіх маёнткаў, за барацьбу супроць падрыхтоўкі вайны, за барацьбу з дзікім самавольствам польскіх акупантаў у Заходняй Украіне і Беларусі. У Польшчы ўведзены вайскова - палявыя суды, якія працуюць шалёнымі тэмпамі.

Ва ўсіх куткох фашысцкай Польшчы вешаюць! Цень шыбельніц пакрыла ўсю краіну!

У катах недахвату няма. Наадварот у Польшчы перавытворства катаў. Сацыял - фашысцкая кракаўская газэта «Вперед» ад 6 лістапада паведаміла, што, у міністэрства юстыцыі бязупынна падаюцца заявы (у сувязі з увядзеньнем вайскова - палявых судоў, якія прысуджаюць звычайна да павешаньня) з прапановаю сваіх паслуг у якасьці катаў. Ня толькі перавытворства чыгуна, сталі, тэкстылю, але і перавытворства катаў... Які забойчы для капіталізму штрык!

Перавытворства катаў — вынік пяцігадовай (1926 — 1931 г.) «асьветнай» работы фашызму. Ён пакінуў у цяні нават добра вядомае хуліганцкае «таварыства 10 сьнежня» Луі Банапарта. І недарма некалькі тыдняў назад на працэсе «цэнтралева», дзе фашысты судзяць фашыстаў, каб затрымаць рэвалюцыянізаваньне мас, таварыш міністра ўнутраных спраў, былы член ППС-лявіцы Стаміроўскі з гордасьцю заявіў, што разумовае разьвіцьцё яго чыноўнікаў вызначаецца іх службовым становішчам.

Фашысцкі дзяржаўны апарат — гэта апарат грамадзянскай вайны, апарат для фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыйнага руху. Гэта—апарат падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Пакуль што адбываецца рэпэтыцыя на ўнутраным фронце. Калісьці вайскова - палявыя суды пачыналі працаваць на другі дзень пасьля абвяшчэньня мабілізацыі. Зараз для таго, каб абвясьціць мабілізацыю, неабходна вялікая папярэдняя работа вайскова - палявых судоў. Дзікі, нястрымны разгул белага тэрору ў фашысцкай Польшчы выклікан ня толькі нарастаючай рэвалюцыйнай барацьбой, але і сваясасьлівай палітыкай «дальняга прыцэлу», падрыхтоўваючага вайну.

У сваім гістарычным турэмным дзеньніку Дзяржынскі 5 чэрвеня 1908 г. пісаў:

«Хто жывы, той павінен памерці, а хто ўмеў так любіць жыцьцё, дык здолее памерці і не атручваць роспачу апошніх хвілін сваіх. І калі-б знайшоўся чалавек, які здолеў-бы перадаць увесь жах жыцьця гэтага мёртвага дому, барацьбу, падзеньне і ўздым сэрцаў кінутых тут на пагібель, перадаў-бы тое, што адбываецца ў сэрцах закутых барацьбітоў і подлых людзей... якіх вядуць і якія вядуць на шыбельніцы. — Тады жыцьцё гэтага дому і яго жахаў ператварылася-б у магутную зброю і палымяны факел для будучай барацьбы, таму неабходна зьбіраць і пераказваць ня хроніку прысуджаных ахвяр, а жыцьцё, усю барацьбу»...

Сталыпінскія шыбельніцы, пра якія пісаў Дзяржынскі, былі пярэднем Кастрычніка. Фашысцкія шыбельніцы — таксама не бар'ер для рэвалюцыі. У іх цяні расьце і мацнее пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы! Польскаму фашызму гісторыя пакінула непараўнаўча менш часу, чымся сталыпінскай Расіі.

Палітычныя вурокі ліста т. Сталіна для гістарычнай навукі

4-ае паседжаньне дэ адніка Камакадэміі

Прадстаўнік Камакадэміі тав. Дубыня выступіў з шырокім дакладам на тэму «Палітычныя вурокі ліста тав. Сталіна для гістарычнай навукі».

— У апошні год,—кажа дакладчык,—на фронце марксыцкай тэарытычнай думкі мы перажываем жорсткую барацьбу за ленінскую мэтадалёгію ў кожнай галіне навукі. Гэты факт тлумачыцца тым, што наша тэарытычная работа самым шчыльным парадкам увязваецца з агульным становішчам у Савецкім Саюзе і са становішчам нашай краіны ў сусьветнай сыстэме, з сусьветным рухам. Абвастрэньне клясавай барацьбы на Захадзе і Ўсходзе, што зьвязана з паглыбляючымся сусьветным эканамічным крызісам, з яго перарастаньнем у крызіс рэвалюцыйны, абвастрэньне клясавай барацьбы зьвязанай з уступленьнем СССР у сацыялізм і ліквідацыяй кулацтва як клясы—усё гэта пакла свой адбітак на сучасную навуку.

Акрэсьлілася выразнае адставаньне навуковага фронту, аб якім сыгналізаваў тав. Сталін на канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстаў, ад задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Працэс фашызацыі і загніваньня навукі выражаецца ў тэарытычным абгрунтаваньні фашызму на базе абароны бясконцых магчымасьцяй разьвіцьця капіталізму на базе барацьбы з марксызмам-ленінізмам, заалёгічнай нянавісьці да СССР. Тэарытычнае абгрунтаваньне і падрыхтоўка інтэрвэнцыі зараз, як асноўныя праблемы, зьяўляюцца найбольш жывымі, найбольш пашыранымі сярод буржуазнай і нацыянал-дэмакратычнай гістарыяграфіі Захаду.

Часта мы маем, што нашы гісторыкі-камуністы знаходзяцца пад уплывам акадэмізму, тады як асноўны вывад ліста тав. Сталіна заключаецца ў тым, што калі толькі хоць на адну хвіліну абстрагавацца ад нашай палітыкі, ад нашай партыі, дык німінуча прыдзеш да паклёпу на партыю, на яе палітыку, на яе гісторыю. Другога шляху няма. Ленін вучыў стаць чотка, ясна і адкрыта на пазыцыю пэўнай партыі і гэту партыйнасьць процістаўіць тым людзям, якія спрабуюць у якасьці гісторыкаў-бальшавікоў высоўваць акадэмічны абстрагізм, буржуазны лібэралізм. Гэтыя людзі стваряюць глебу для фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму.

Ігнараваньне ленінскай спадчыны ў разуменьні асноўных праблем прыводзіць рад гісторыкаў да вялікіх палітычных памылак. Вядомы гісторык Лукін, ігнаруючы Леніна, прыйшоў да гільфэрдынгскага разуменьня імпэрыялізму, а акадэмік Волгін да буйнейшых мэтадалёгічных памылак, якія ня выпраўлены і зараз.

Толькі паставіўшы вывучэньне гісторыі нашай партыі на бальшавіцкія навуковыя асновы, змагаючыся з рознымі фальсіфікатарамі—толькі гэтым мы зможам забясьпечыць бальшавіцкую крытыку, выключым магчымасьць праяўленьня ў нашым асяродзьдзі лібэралізму ў адносінах трацкісцкай кантрабанды.

Калі нам удасца ўсю ўвагу гісторыкаў-марксыстаў сканцэнтраваць на распрацоўцы вывучэньня Леніна, на ўзьняцьце прынцыповых пытаньняў на належную тэарэтычную і палітычную вышыню, калі мы здолеем паставіць усе праблемы пастаўленыя тав. Сталіным у цэнтры ўвагі—тады мы будзем мець непахісную базу адзінага бальшавіцкага фронту. У гэтым аснова!

5-е паседжаньне дэкадэ'іка Камакадэміі

Прадстаўнік Камакадэміі тав. Бутаеў выступіў з дакладам на тэму аб уступленьні ў перыяд сацыялізму. Зараз зьяўляецца відавочным,—кажа дакладчык,—што жорсткая барацьба двух сыстэм, сацыялістычнай і капіталістычнай будзе скончана перамогай сацыялізму. Трацкізм, адмаўляючы магчымасьць пабудовы сацыялізму, стаў на шлях адкрытай контрэвалюцыі, ператварыўся ў перадавы атрад буржуазіі.

Зараз мы перажываем момант, калі асноўныя сродкі вытворчасьці ў краіне аграмаджаны, прамысловасьць, транспарт, крэдытная сыстэма і г. д., а гэта ёсьць першая неабходная ўмова для ўступленьня ў сацыялізм. Мы забясьпечылі разьвіцьцё вытворчых сіл сацыялістычнай формы і гэта ёсьць рашаючы момант, каб сказаць, што наступіў перыяд сацыялізму.

Сацыялістычная гаспадарка—плянавая гаспадарка, а мы маем такое становішча, калі амаль усе галіны гаспадаркі мы разгортваем, разьвіваем, узвязваючы з агульным плянам сацыялістычнага будаўніцтва. Сацыялізм мае на ўвазе сьвяломыя адносіны да справы, масавы рух большасьці народаў, большасьць усяго насельніцтва пад кіраўніцтвам адзінай партыі ў кірунку будаўніцтва сацыялізму. Масавы-ж творчы энтузіям у нас пераражаецца ў сацыялістычнае спаборніцтва, у сацыялістычныя адносіны да працы, сацыялістычны сэктар у нас абумаўляе нашае поўнае разьвіцьцё.

Ленін гаварыў, што калі мы адарвем селяніна ад прыватнай уласнасьці, павернем да нашай дзяржаўнай работы, тады магчыма сказаць, што мы зрабілі цяжкую частку нашага шляху, а ў гэтых адносінах дамагліся павароту. Бядняцка-серадняцкая маса сялянства ахоплена калектывізацыяй на 60 проц., праводзіцца вялікая работа па ўмацаваньні калгасаў, вынімаюцца супярэчнасьці паміж пралетарыятам і сялянствам, гэтыя супярэчнасьці вырашаюцца на карысьць сацыялізму.

Сацыялізм мае на ўвазе зьнішчэньне клясаў, бясклясавую грамаду. І мы яшчэ ў першы этап рэвалюцыі ў гэтым напрамку зрабілі шмат, зьнішчылі капіталістаў і паменшылі кулаў. Сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце ў рэканструкцыйны перыяд, калектывізацыя, уцягненьне бядняцка-серадняцкага сялянства ў сацыялістычнае будаўніцтва, ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі — працэсы зьнішчэньня клясаў. Характарызуючы нашы калгасы мы не павінны забываць, што гэта—далейшы шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі на шляху сацыялізму.

У сваім дакладзе тав. Бутаеў падаў шмат увагі крытыцы розных варожых тэорый, якія даводзяць, што наша сучасная форма працы, як зьдзельшчына, прэм'яльна - прагрэсыўная аплата працы—капіталістычная форма працы. Гэтая трацкісцкая кантрабанда ў сваім лёгічным выніку абараняе абязьлічку, ураўнілаўку, падрывае зьдзельшчыну як сацыялістычны прынцып працы. Праз зьдзельшчыну мы змагаемся за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, каб шпарчэй шымі тэмпамі ісьці наперад.

Наш далейшы поступ наперад зьвязаны з барацьбой над разьвязваньнем труднасьцяй арганізацыі працы, вучоту, забясьпечаньня, з барацьбой за выкананьне 6 умоў тав. Сталіна.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ДЭКАДНІК КОМАКАДЭМІІ.

Сёньня 18 сьнежня роўна а 7 гадзіне адбудзецца даклад тав. Э. Кольмана на тэму: «Становішча і задачы фронту прыродазнаўства».

Арг. Камісія па правядзеньні дэкадніка.

Народны Камісарыят Асьветы склікае ўсебеларускія курсы - канфэрэнцыю масавых бібліятэчных работнікаў БССР.

Курсы-канфэрэнцыя адбудзецца з 20-XII па 1-1-32 г. Тэрмін на 10 дзён, пачатак 20-XII а 6 гадз. увечары. Дэлегатам патрэбна зьявіцца ў НКАсьветы.

Менгарком КП(б)Б разам з рэдакцыяй газэты «Акцябр» склікае 19-га сьнежня ў 7 гадз. увечары ў памяшканьні Гаркому КП(б)Б (заля паседжаньня, 3-ці паверх) нараду партактыву каапэрацыйна - гандлёвых арганізацый гораду.

Парадак дня.

1. Аб арганізацыі працы ў магазыне і перабудова партыйна - масавай работы.

2. Падрыхтоўка да 2-й парт. канфэрэнцыі.

На нараду павінны зьявіцца: 3-х кутнікі (партыйцы) ЦРК, галінных аб'яднаньняў (раздробных) БКС, Белгандлю, ТПО, ЗВК, загадчыкі магазынаў усіх сыстэм (партыйцы), фракцыя ЦП Саюзу і ГК саюзу каапэрацыйных работнікаў.

Яўка без спазьненьня.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.
Рэдакцыя газэты «Акцябр».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Даводзіцца да ведама ўсіх чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў аб дачасным сьмерці заслужанага чырвонага партызана, члена КП(б)Б, работніка Наркамснабу

Тав. ПРЭАБРАЖЭНСКАГА Сяргея

Пахаваньне адбудзецца 18 сьнежня 1931 г., а 1 гадзіне дня. Вынас цела з памяшканьня Наркамснабу.

Яўка ўсіх партызан і чырвонагвардзейцаў а 12 гадз. 30 хвіл. у памяшканьне партызанскай камісіі (будынак Гарсавету) абавязкова.

Старшыня Менскай партызанскай камісіі Яраш ў

Гукавы кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ГОРКА. Пач. 6, 7-30, 9, 10-30. Каса з 1 дня. Новы гукавы фільм **ШТОРМ**. Звыш праграмы гукавы фільм ПАСІФІК

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА. Пач. а 7, 8-45, 10-20. Каса ад 5 г. Мастацкі фільм **АНУШ**. Звыш праграмы **Лодырам канец** у 1 часткі.

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. Пач. 2, 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса ад 12 г. Камэдыя замежны фільм **МАРАЛЬ**. Звыш праграмы ХРОНІКА

Кіно ГАРАЛЕТАРЫ. Пачатак а 2 гадз. Э. Цэсарская **2 МАТКІ 2** у 6 частках

Цэнтральны Камітэт Т-ва Чырвонага Крыжу БССР (Менск, Першамайская, 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян,

якім належыць спадчына пасьля памершых у Амэрыцы родных:

Банькоў Хлавіна (Славіна) Сэма (Самуіла).

Родных Шэсэ р Абрама.

Банькоў, жонку ці дзяцей Сміта Вільяма (Васіля).

Родных Тарэс Альбэрта.

КОШТ публікацыі АБ ЗГУБЕ АДНАГО дакумэнту **1 р.**

ПРАВІЛА ПРЫЁМУ НА КУРСЫ

па падрыхтоўцы ў ВНУ саюзу рабочых МТС і батрацтва

ЦП саюзу рабочых МТС і батрацтва паведамляе, што з 1 студзеня 32 г. пры Водна Мэліяцыйным Інстытуце ў Горках адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

Курсы арганізуюцца ў складзе 2-х груп, па 50 чал. у кожнай групе, з працягам работы адной групы ў 5 м-цаў і другой групы ў 8 м-цаў.

На курсы прымаюцца: рабочыя МТС і МТМ батрак і рабочыя астатніх прадпрыемстваў, абслугоўваных саюзам рабочых МТС і батрацтва, у першую чаргу рабочыя-ударн к.

Узрост паступаючых на курсы ад 17 да 34 гадоў уключна, вытворчы стаж ня менш 3-х год і прафстаж ня менш 1 году.

Увага 1. На курсы могуць быць прыняты батракі і ня члены саюзу—члены калгасаў, а таксама батракі, працуючыя па найму ў індывідуальным сэктары.

Увага 2. Былыя батракі і рабочыя раней працаваўшыя ў сыстэме абслугоўваньня саюзу рабочых МТС батрацтва, якія зараз выбылі ў другія саюзы ў зьвязку з пераходам на другую работу (вылучэньне, вярбоўка ў прамысловасьць, саўгасы і г. д.) пры ўмове пераходу на другую работу ня больш 2-х гадоў таму назад.

Пасьведчаньні на курсы прымаюцца:

а) на 5-цім сямігодным падрыхтоўчым курсы скончыўшыя сямігодку, скончыўшыя 5 і шостыя групы сямігодак, альбо маючыя агульную адукацыю ў гэтым абёме;

б) на 8-м месячныя курсы скончыўшыя 4-хгодку, альбо маючыя агульную адукацыю ў гэтым абёме.

З камандыруемых на курсы павінны быць ня менш 40 проц. жанчын.

Курсанты забясьпечваюцца стыпендыяй у разьмеры 50 руб. у месяц і кватэрай (пры ўмове непрастаўленьня кватэры курсамі выплачваюцца кватэрныя).

Жадаючыя паступіць на курсы павінны не пазьней 25-XII 31 г. прадставіць дакумэнты непасрэдна на адрасу: гор. Горкі Водна-Мэліяцыйнаму Інстытуту, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ саюзу рабочых МТС і батрацтва.

Паступаючыя на курсы павінны прадставіць наступныя дакумэнты: заяву аб прыёме на курсы, запоўненую анкету для паступаючых у ВНУ, заверэную рабачкомам саюзу рабочых МТС і батрацтва, даведку аб узросьце, аб адукацыі, аб становішчы здароўя, аб вытворчым стажы, аб сац. становішчы бацькоў, аб карыстаньні бацькамі паступаючага і самага паступаючага выбарчымі правамі і выпіску з пастановы рабачкому саюзу рабочых МТС і батрацтва аб камандыраваньні на курсы.

Скончыўшыя курсы будуць накіраваны на вучобу выключна ў Водна-Мэліяцыйны Інстытут.

Для разбору заяў пры курсах ствараецца камісія ў складзе:

1. Прадстаўніка ЦК (старшыня камісіі).
2. Загадчыка курсамі.
3. Прадстаўніка ад навучальнай часткі інстытуту.
4. Па аднаму прадстаўніку ад парт. і КСМ арганізацый інстытуту.
5. Дзе рабочых-ударнікоў ад рабачкома Горацкай МТС.

Аб прыёме на курсы паведамляюць кожнага ў паасобку самі курсы.

Пачатак заняткаў на курсах 1-га студзеня 1932 г.

Цэнтральнае праўленьне саюзу рабочых МТС і батрацтва.

КІРАЎНІЦТВА ЛУГГАСАЎ БССР

АДКРЫВАЕ Ў г. МЕНСКУ ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ МЭХАНІЗАЦЫІ

4-хмесячныя КУРСЫ

ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ТРАКТАРНЫХ БРЫГАДЗІРАЎ

Жадаючыя паступіць на паказаныя курсы, павінны падаць заявы ў кіраўніцтва луггасаў (Менск, Пляц Волі, 7, 4-ты паверх, пакой № 410) да 20-га сьнежня 1931 г.

Да заявы неабходна прыкласьці спраўкі аб рабоце на трактары ня менш году.

Курсанты забясьпечваюцца стыпендыяй у суме 50 рублёў у месяц.

ІНТЭРНАТАМ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЦА

АДКРЫТ НАБОР

у Віцебскую ШКОЛУ ГРАМАДЗЯНСКІХ ЛЁТНІКАЎ імя ВАРАШЫЛАВА К. Е.

Прыймовая камісія для іншагародніх будзе працаваць 5 студзеня 1932 г.

ВЫЛУЧАНЫМ КАНДЫДАТАМ ПРЫБЫЦЬ у гор. ВІЦЕБСК 4 студзеня 32 г. (Пляц Працы, пакой № 4)

Даведкі аб умовах прыёму атрымаць у мясцовых саветах Асаавіяхіму

Віцебскі Гарсавет Асаавіяхіму

1932 год ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА 1932 год

НА КРАЯЗНАЎЧЫ ЧАСОПІС

„САВЕЦКАЯ КРАІНА"

Орган Масавага Сэктару БАН і Цэнтральнага Бюро Краязнаўства

Умовы падпіскі: НА ГОД—4 руб., на 9 мес.—3 р. 25 к., на 6 мес.—2 р. 25 к., на 3 мес.—1 руб. 25 к., на 1 мес.—50 к.

Цана асобнага нумару 50 кап.

Падпіска прымаецца на пошце, у раённых кнігарнях, у раённых бюро краязнаўства.

РЭДАКЦЫЯ.

Даводзіцца да ведама ўсіх установаў і прыватных асоб, што на падставе пастановы Прэзыдыуму Белаавіярамсаюзу ад 22 в расьня 1931 г.

Талачынскі Райпрамсаюз

ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе правы і абавязкі Райпрамсаюзу перадаюцца Аршанскім і Барысаўскім шматпрамысловым і сацыяльным саюзам.

Прэтэнзіі да б. Талачынскага Райпрамсаюзу прымаюцца ліквідкомам да 22 сьнежня 1931 г.

ЛІКВІДКОМ

ЗГУБЛЕНЫ

Пасьведчаньне выпускніка Менскай Мсьціслаўск. сельскай школы № 1 на імя Давыдзіцкага Е.

Асабовая вайсковая кніжка нарадж. 1909 г. Кобыльскага Х. Е. выд. Менскім ваенкаматам.

Талон асабовага пасьведчаньня Чарнускага В. выд. Беларускім саюзам рабочых.

Сяброўскі білет саюзу нарсувязі № 8388 Чарнускага.

Вуднны білет спецыяльнага Чарнілоўскага В. А. выд. Вуднай біржай працы.

Сяброўскі білет саюзу нарсувязі Гірвіча Г. І., выд. Менскім рабачкомам Беларадыёцэнтру.

Сталае пасьвед. асаб. № 36, Гурвіча І., выд. Беларадыёцэнтрам:

Сталы пропуск на права ўваходу на радыёстанцыю Гурвіча Г.

Пашпарт Гурвіча Г. І., выд. 2-м аддз. Менскарміліцыі.

Шлюбная выпіска Прупос-Борсук, выд. Менскім ЗАГС-ам.

Вайсковая кніжка нарадж. 1909 г., выд. Жыткавіцкім ваенкаматам Глушэня Г. В.

Членскі білет саюзу сельгаслесрабочых № 28833, Акімава В. А.

Вайсковая кніжка Каваленя Ц. І., вальня Р. І., выд. Старобінскім ваенвыд. Старобінскім ваенкаматам нарадж. 1905 г.

Вайсковы білет нарадж. 1909 г. Какаматам:

Віза выд. пагранатрадам на праезд са ст. Менск да ст. Беларусь Трайко Ганны.

Мэтрычн. выпіска Ламаноўскага А. І., выд. Менскім ЗАГС-ам.

Мэтрычн. выпіс Ламаноўскай Е. І., выд: Менскім ЗАГС-ам.

Мэтрычн. выпіс Салаўёвай Л. М., выд: Менскім ЗАГС-ам.

Мэтрычн. выпіс Дудкоўскага І. І., выд: Менскім ЗАГС-ам.

Каапэр. кніжка Дудкоўскага І. І., выд. Койданаўскім рабкоопам.

Сяброўскі білет № 1285, выд. Мсьціслаўск. Райкомам саюза працаўзетыГрынкевіча Я. Я.

Мэтрычн. выпіска нарадж. 1923 г. Грынкевіча Л. І., выд. Карнянск: РВК:

Вайсковы білет Меляшкевіча Антона, выд. Сеніцкім ВВК у 1923 г.

Мэтрычная выпіска аб нарадж. Меляшкевіча Вікенція, выд. Трасьцянецкім сельсаветам.

Мэтрычн. выпіс Мінкова Саламона, выд: Менскім ЗАГС-ам.

Службовы сьпіс Дубіна В. А., выд. саўгасам Жмуроўка Белсельгастрэст.

Каманд. пасьв. Дубіна В. А., выд. Рэчыцкім Райкаапсаюзам.

Чырвонапартызан. білет № 4974 і паляўн. білет Осіпава Ц. П., выд. Карнянскім саюзам паляўнічых.

Сяброўскі білет Сапуна М. А., выд. саюзам нарсувязі.

Пропуск № 902 Сапуна М. А., выд. кіраўніцтвам сувязі.

Даведка аб працы з 14-XI 1930 г. па 1-V 1931 г. Сапуна М. А., выд. паштова - тэлеграфн. канторай.

Мэтрычн. выпіска Шымановай Веры, выд: Менскім ЗАГС-ам.

Даведка аб выбарчых правах Зыля К. С., выд. Азерыцка-Слабодзк. сельсаветам, Смалявіцкага раёну.

Асабов. пасьведчаньне, з фатаграф карткамі Зыля К. С., выд. нач. аддз. МБВ чыг.

Пасьведчаньне аб атрыманьні разьліку для прадстаўленьня ў Маскву Зыля К. С., выд. Нач. МБВ чыг.

Вайсковая кніжка Бараўнёва В. П., выд. Ляднянскім РВК.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—1-78, сэктара—6-15. Выдавецтва—22-44. Выпускаючага 12-65 два званка
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў— 9 р., 1 год—12 руб. Выхадныя дні 5, 10, 15, 20, 25, 30.

Уваўнаваж. Галоўлітбелу № А—2522

Друкарня імя Сталіна

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2